Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
14 ЛЮТАГА 2018 г. СЕРАДА № 31 (28647)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## У Белдзяржцырку пакажуць «Лядовую феерыю»

СТАР. 4



## Новыя электрамабілі прыходзяць у Беларусь

СТАР. 11



## «Залатая» гісторыя кахання

СТАР. 12

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$9,7 млрд**

*інвестыцый уклалі ў рэальны сектар эканомікі Беларусі за 2017 год (акрамя банкаў) замежныя інвестары, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Асноўнымі інвестарамі арганізацый краіны былі суб'екты гаспадарання Расійскай Федэрацыі (38 % ад усіх інвестыцый), Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі (26,6 %), Кіпра (7,2 %). Паступленне прамых замежных інвестыцый склала $7,6 млрд. За 2017 год арганізацыямі краіны (акрамя банкаў) накіравана за мяжу інвестыцый на суму $5,5 млрд. Значныя аб'ёмы інвестыцый арганізацыямі накіраваны суб'ектам гаспадарання Расійскай Федэрацыі (66,9 % ад усіх накіраваных інвестыцый), Украіны (17,3 %).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9918 | ▼ |
| Еўра | 2,4530 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0344 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X




# «ЗАВЕЗЛІ ДЗЕДА ЗА СЯЛО, І ЎСІМ СТАЛА ВЕСЯЛО...»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Такое незвычайнае спалучэнне супрацьлеглых па значэнні слоў («Дзеда» ж, па сутнасці, вязуць хаваць) можна пачуць толькі на пачатку масленічнага тыдня і ў адзіным раёне Віцебскай вобласці — Гарадоцкім. А менавіта ў вёсцы Даўгаполле, дзе па старажытнай завядзёнцы спраўляюць вясёлае абрадавае ігрышча для дарослых — «Пахаванне Дзеда». На Поўначы Беларусі бытавала менавіта гэткая форма развітання з зімою. Калі ў іншых рэгіёнах славянскіх земляў праводзіўся абрад спальвання саламянага пудзіла, тут, на Гарадоччыне, саламянага «Дзеда» закопвалі ў снег. Пры гэтым і галашэнне па «нябожчыку», і праводзіны яго за вёску, і «памінкі» прымаюць анекдатычны характар, лічыцца, што чым больш весялосці, пацехі, гумару «на хаўтурах», тым лепшая будзе сустрэча вясны.**

СТАР. 5

■ Выбары-2018

## ЧЫМ БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ, ТЫМ БЛІЖЭЙ ДА ЖЫЦЦЯ



**«У дэпутатаў парламента і мясцовых Саветаў ёсць шырокая прастора для праяўлення ініцыятывы і актыўнасці», — заявіў у інтэрв'ю «Звяздзе» старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

**— Уладзімір Паўлавіч, вы прайшлі ўнікальную дэпутацкую школу ў мясцовых Саветах, Вярхоўным Савеце БССР, Савеце Рэспублікі і ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, якую ўзначальваеце ўжо трэцяе скліканне. Скажыце з вышыні вашага вопыту, якую ўладу мае дэпутат?**

— Улада дэпутата — гэта яго ўплыў на вырашэнне канкрэтных сацыяльна-эканамічных праблем і пытанняў, важных для людзей, тэрыторый, рэгіёнаў і краіны, на грамадска-палітычныя падзеі і грамадскія працэсы. Зразумела, у рамках сваёй кампетэнцыі, вызначанай заканадаўствам. Я думаю так, калі гаварыць коратка.

СТАР. 2

## УРАНАВЫ САРДЭЧНІК У МЕТАЛАЛОМЕ

### Як абыходзіцца з атрутнымі рэчывамі?

**Хімічныя і радыеактыўныя рэчывы даўно сталі незаменнымі памочнікамі ў многіх сферах. Калі з імі абыходзіцца па прапісаным рэгламенце, то нічога дрэннага не здарыцца. А калі праявіць неахайнасць? Вось тут у дзеянне і ўступаюць байцы Цэнтра хімічнай і радыяцыйнай абароны Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Аб тым, з чым жа даводзіцца ім працаваць, карэспандэнт «Звязды» распытаў начальніка Цэнтра Васіля ШАЛЕПІНА.**

### «Фаніў» пясок з пляжа

— Апошні выклік, звязаны з радыеактыўным выпраменьваннем, здарыўся зусім нядаўна ў аэрапорце. Дзяўчына ляцела транзітам праз Беларусь з Кіпра ў Расію. І вось пры наглядзе багажу спрацаваў датчык, які выяўляе павышаную радыяцыю. Аказалася, што «фаніў»... кварцавы пясок, які дзяўчына набрала на пляжы ў якасці сувеніра. Крыміналу тут не было — зразумела, што з дазіметрам на пляж турыст не пойдзе. Згодна з правіламі перавозак, чалавек можа перавозіць з сабой грузы, у якіх магутнасць эквівалентнай дозы не перавышае 1 мікразіверт. А пясок паказаў крыху большае перавышэнне. Выклікалі нас. Мы зрабілі вельмі дакладныя замеры, і аказалася, што насамрэч да мяжы ў 1 мікразіверт доза крыху не дацягвае. У рэшце рэшт дзяўчына працягнула свой шлях у Маскву на іншым рэйсе, а выдаткі ёй кампенсавалі. І пытанняў ні ў кога не засталося.

СТАР. 4

# СПАКОЙ НЕ ЗНАЧЫЦЬ САМАЗАСПАКАЕННЕ

## Прэзідэнт пра тое, што трэба зрабіць для паляпшэння дзяржаўнай бяспекі

**Што можа быць больш важным, чым бяспека — у гарадах, у небе над галавой і, урэшце, дома ў кожнага з нас. Мір у краіне — гэта падмурак для таго, каб грамадства магло спакойна, паступова развівацца і надалей, а не штораз падымацца з руін. Беларусь сапраўды можа ганарыцца тым, што мы маем магчымасць без асцярогі хадзіць па вуліцах, што не трапляем у сусветную тэндэнцыю няўстойлівасці і нестабільнасці. Але ці гэта нагода самазаспакойвацца? Падчас пасяджэння Савета Бяспекі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заклікаў адпаведныя дзяржаўныя органы заставацца пільнымі і няспынна, штодзённа паляпшаць сістэму аховы грамадзян.**

На жаль, з кожным годам свет становіцца ўсё больш трывожным, усё часцей мы бачым сутыкненне інтарэсаў дзяржаў, заўважыў Прэзідэнт. Так, ні адзін з існуючых узброеных канфліктаў за мінулы год не быў пагашаны, затое з'явіліся новыя, а палітычная канфрантацыя стала часткай нацыянальных стратэгій, а не выключэннем. Свет на мяжы глабальнага супрацьстаяння, якое падсілкоўваецца спекуляцыямі з ядзернай зброяй, мілітарызацыяй Усходне-Еўрапейскага рэгіёна і нарошчваннем ваеннага патэнцыялу краін — суседак Беларусі.

Асаблівую трывогу выклікае становішча ва Украіне. У Мінску адбылося амаль трыццаць сустрэч Трохбаковай кантактнай групы па ўрэгуляванні сітуацыі на паўднёвым усходзе нашай суседкі. І якія б меркаванні ні існавалі, але факт застаецца фактам: альтэрнатывы гэтай пляцоўцы для перагавораў на дадзены момант не існуе. У сітуацыі, калі для міжнароднага ціску выкарыстоўваецца не толькі зброя, але і санкцыі, інфармацыйныя аперацыі, эканамічныя рычагі, асабліва важнымі становяцца саюзніцкія адносіны.

Так, у мінулым годзе наша краіна старшынствавала ў Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы. «Нам удалося прыняць шэраг мер, накіраваных на развіццё ўзброеных сіл краін АДКБ, умацаванне іх ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва, узмацненне пазіцый у свеце, — адзначыў Прэзідэнт. — Павінен вам сказаць, нягледзячы на намаганні, якія намі прымаліся, — мы выходзілі з магчымага, уносілі на разгляд тыя пытанні, якія магчыма прыняць нават у такім невялікім фармаце па колькасці, як АДКБ. Цяжка ўзгадняюцца пытанні, якія нясуць вялікія матэрыяльныя затраты. Я маю на ўвазе ўзбраенне».

«Калі ўвогуле гаварыць, мы вельмі сур'ёзна ў АДКБ недаацэньваем небяспеку той сітуацыі, якая складваецца. Расія сама па сабе мадэрнізуе ўзброеныя сілы. Мы спрабуем разам з іншымі членамі арганізацыі ўзброіцца, мадэрнізавацца і гэтак далей. Кожны сам па сабе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Асноўны цяжар па абароне агульнай прасторы ў выпадку неабходнасці, зразумела, ляжа на Расію. «Але сур'ёзнага разумення ў кіраўніцтва Расіі сёння аб тым, што трэба на найбольш небяспечных напрамках нашай агульнай сумеснай абароны ўмацоўваць нацыянальныя ўзброеныя сілы — Беларусі, Казахстана, Арменіі, іншых краін, — такога разумення няма. І гэта вельмі балюча можа адгукнуцца», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Таму ў гэтых адносінах нам вельмі сур'ёзна, прынамсі, пасля прэзідэнцкіх выбараў у Расіі, трэба падумаць і прымаць рашэнне. Нам трэба самым сур'ёзным чынам не проста мадэрнізаваць нашы ўзброеныя сілы, а трэба ўдасканальваць і больш актыўна прыстасоўваць да магчымых баявых дзеянняў. Магчымых. Зыходзячы з вопыту вядзення войнаў і канфліктаў у сучасны час», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў сувязі з гэтым асаблівае значэнне мае стратэгічнае партнёрства з Расіяй. «Нягледзячы на розныя домыслы, інфармацыйную шуміху, роўна і спакойна праведзена сумеснае стратэгічнае вучэнне «Захад-2017». Цяпер сумесна выпрацоўваюцца меры па знячці перашкод у пагранічнай і мытнай сферы, у галіне візавай палітыкі і іншыя», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што асноўным пытаннем пасяджэння мусіць стаць ваенная бяспека дзяржавы, і таму выразна паставіў задачы перад Міністэрствам абароны. А гэта — набыццё самага неабходнага, размеркаванне сродкаў з максімальнай эфектыўнасцю і недапушчэнне «размазвання» грошай. «Папярэджваю міністра абароны, і на гэта мною будзе звернута асаблівая ўвага: усё, што ёсць у арміі, — а ў арміі ёсць нямала, — пачынаючы ад стралковай зброі, бранятэхнікі і заканчваючы лятальнымі апаратамі і ракетамі, — павінна быць у ідэальным стане. Скаргі на тое, што недзе шасцярэнькі ў танку або ў БМП, БТР не хапае або недзе ствол падрапаны, не прымаюцца. Вы павінны быць сапраўднымі гаспадарамі і берагчы маёмасць: гэта сёння нятанна каштуе, а яна нам вельмі патрэбна», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у краіне прыняты даволі строгія, але своечасовыя меры па развіцці беларускага ваенна-прамысловага комплексу. «Да гэтага часу ў Беларусі ўдалося стварыць, можна так сказаць, крэатыўны кластар у асобе генеральных канструктараў і спецыялістаў ваенных вытворчасцяў», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на асабісты склад арміі. Прэзідэнт падкрэсліў, што выпадкі нестатутных узаемаадносін і іншыя парушэнні — гэта тыя з'явы, пра якія ў беларускай арміі, здавалася б, павінны даўно забыць. «Чым займаецца ідэалагічная і выхаваўчая вертыкаль у ваенным ведамстве? Як відаць, адпаведныя кіраўнікі закрыліся паперамі, фармалізмам і даўно ўстарэлымі формамі работы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Другое важнае пытанне ў парадку дня пасяджэння — забеспячэнне правапарадку і абароны грамадзян. Гэта ўсё тое, у імя чаго мы жывём і ў імя чаго існуе ўся наша ўлада, — адзначыў Прэзідэнт. — У краіне ўдаецца многае зрабіць для бяспекі людзей. Абароне грамадства і кожнага чалавека ў Беларусі заўсёды надаецца першараднае значэнне. Мы па праве ганарымся, што Беларусь у нас адносна спакойная і бяспечная краіна».

«Сёння выразна прасочваюцца тэндэнцыі зніжэння злачыннасці. За апошнія дзесяць з невялікім гадоў удвая знізіўся ўзровень крымінілізацыі грамадства. Зменшылася колькасць пацярпелых з-за злачынных замахаў, а таксама колькасць дарожна-транспартных здарэнняў. У тры разы менш садзіцца за руль нецвярозых кіроўцаў, скарачаецца колькасць злачынстваў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць таго, што няўхільна павышаецца раскрывальнасць злачынстваў. Усё радзей у аператыўных зводках фігуруюць падлеткі. Палепшылася абстаноўка на вуліцах гарадоў і ў сельскай мясцовасці. Даволі эфектыўна працуе сістэма па выяўленні і спыненні карупцыі. Пры гэтым, падкрэсліў Прэзідэнт, супакойвацца ні ў якім разе нельга, абстаноўка яшчэ вельмі далёкая ад спрыяльнай.

«Беларусь цяпер не ўзрушваюць буйныя аварыі, і даволі хутка пераадольваюцца наступствы непагадзі», — заўважыў ён. Пры гэтым Прэзідэнт звярнуў увагу: на пажарах гіне практычна ў тры разы менш людзей, чым дзесяць гадоў таму, дзяцей — менш у 15 разоў. Больш як удвая скарацілася колькасць загінулых на вытворчасці, а тых, хто знаходзіўся пры гэтым у нецвярозым стане, — у чатыры разы.

«Аднак і пяцьсот чалавек у год, якія загінулі на пажарах, — гэта недапушчальная для нас лічба. На дарогах тысяча чалавек загінула і на пажарах пяцьсот — усяго тысяча пяцьсот», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Галоўнае, да чаго заклікаў кіраўнік дзяржавы не толькі органы бяспекі, але і кожнае ведамства і ўвогуле кожнага грамадзяніна, — не самазаспакойвацца, што ўсё добра, і не чакаць указанняў зверху, каб змяніць сітуацыю ў сваёй сферы да лепшага, а рабіць гэта самастойна і штодзённа.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ЧЫМ БЛІЖЭЙ ДА ЛЮДЗЕЙ...

***(Заканчэнне.***
***Пачатак на 1-й стар.)***

**— Маеце на ўвазе парламентарыяў?**

— Чаму толькі іх? Дэпутатаў усіх прадстаўнічых дзяржаўных органаў — і парламента, і мясцовых Саветаў. Мы робім адну справу.

**— Але ж адказнасць розная — ёсць агульнанацыянальныя, рэспубліканскія задачы, а ёсць і мясцовыя, рэгіянальныя.**

— Адказнасць — яна ва ўсім адказнасць. Без вырашэння гэтых задач як на дзяржаўным, так і мясцовым узроўнях эфектыўнага руху краіны наперад і развіцця рэгіёнаў не будзе. Вось такая непарыўная між імі ўзаемасувязь.

**— На нядаўняй рабочай сустрэчы з вамі Прэзідэнт звярнуў сур'ёзную ўвагу на неабходнасць умацавання работы дэпутатаў у выбарчых акругах. Як Палата прадстаўнікоў мяркуе рэалізоўваць гэта ўказанне?**

— Мы не проста мяркуем выконваць, а выконваем рэкамендацыі і задачы, пастаўленыя кіраўніком дзяржавы. Гэта датычыцца таксама нашай заканатворчай і міжнароднай дзейнасці. Усё гэта пытанні эфектыўнасці парламента, якасці ажыццяўлення дэпутатамі сваіх паўнамоцтваў. Напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы, як падкрэсліў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, асабліва важна быць бліжэй да людзей і мясцовых органаў улады. Скажу вам, нішто ў заканадаўчай, як і ўвогуле ў парламенцкай дзейнасці, не можа замяніць асабістага кантакту, шчырай, адкрытай размовы з людзьмі па ўсіх праблемах, якія іх хвалююць. Вытокам многіх заканадаўчых навацый па сацыяльных, гаспадарчых і праваахоўных пытаннях, у тым ліку па вельмі адчувальных, з'яўляецца менавіта дэпутацкая работа ў выбарчых акругах. З рэгіёнаў дэпутаты прывозяць і свае прапановы, якія ўлічваюцца пры карэкціроўцы заканадаўства, у рашэннях урада і іншых дзяржаўных органаў.

**— Вялікі грамадскі рэзананс выклікалі дэкрэты кіраўніка дзяржавы аб развіцці прадпрымальніцтва і садзейнічанні занятасці насельніцтва. Што ў гэтым кантэксце асабліва важна для дэпутацкага корпуса парламента?**

— Сістэмныя меры па паляпшэнні дзелавога клімату і вырашэнні праблем занятасці маюць вялікае значэнне для сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Парламенту трэба будзе правесці карэкціроўку эканамічнага, грамадзянскага і іншага заканадаўства. Гэта адзін з наших заканатворчых прыярытэтаў. Што датычыцца выбарчых акруг, то на першым плане для нас канкрэтныя пытанні працаўладкавання непрацуючых грамадзян і інфармацыйна-растлумачальная работа, чым і займаюцца дэпутаты. Важна тлумачыць меры, якія прымае дзяржава па ключавых пазіцыях сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і ўмацавання нацыянальнай бяспекі. Гэта вельмі грамадска значная справа. Рабіць яе трэба з глыбокім веданнем, прафесіянальна.

**— Наколькі магчыма прыцягнуць да працаўладкавання тых працаздольных грамадзян, якія працаваць не хочуць?**

— Праблема сацыяльнага інфантылізму і спажывецтва ўзнікла не сёння і не ўчора. Ёй далі патачку ў савецкі час. Таму няпроста ўзараць гэту няўдобіцу. Навацыі Дэкрэта № 1 з'явіліся праз актыўны дыялог улады з грамадскасцю і адкрываюць перспектыву вырашэння сур'ёзнай грамадскай праблемы. У гэтым наш грамадскі і дзяржаўны інтарэс. І яго трэба актыўна і мэтанакіравана ажыццяўляць. Каму тут быць на правым флангу, як не выканаўчым камітэтам і мясцовым Саветам — самым блізкім да людзей органам дзяржаўнай улады?

Я лічу, што названыя дэкрэты Прэзідэнта адкрываюць новую прастору для прымянення ініцыятывы і актыўнасці дэпутатаў усіх узроўняў. Ад іх настойлівасці ў многім залежыць не толькі вырашэнне сацыяльных, камунальных і бытавых пытанняў, але і вытворчых. Уменне, калі патрэбна, падштурхнуць кіраўнікоў прадпрыемстваў і раённых улады ўшчыльную заняцца павышэннем эфектыўнасці вытворчасці, мадэрнізацыяй, стварэннем новых працоўных месцаў мае немалое значэнне. Гэта датычыцца і вырашэння пытанняў занятасці. Адна сітуацыя, калі чалавек часова не працуе па ўважлівай прычыне, і другая, калі свядома сядзіць на шыі сваіх блізкіх і дзяржавы, вядзе непрыстойны лад жыцця. У кожным выпадку патрэбен індывідуальны падыход — канкрэтны, акуратны і ўзважаны. Мы бачым у рэгіёнах, што такі падыход дазваляе весці вельмі плённую работу па прыцягненні непрацуючых грамадзян да малога прадпрымальніцтва, рамесніцтва, у сферы гандлю, паслуг і да іншых відаў дзейнасці ў залежнасці ад спецыфікі рэгіёна ці тэрыторыі, стымулюе самазанятасць. Невырашальнымі праблемы не здаюцца, калі іх стараюцца вырашаць.

**— На вашу думку, ці ёсць у парламентарыя магчымасць максімальна аператыўна рэагаваць на нестандартныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у выбарчай акрузе?**

— У гэтым пытанні адчуваецца няўпэўненасць, але я не сумняваюся ў такой магчымасці, калі зваротная сувязь дэпутата з грамадзянамі і мясцовымі органамі ўлады працуе як гадзіннік. Добры гадзіннік ніколі не адстае. Трэба ведаць усе асабліва пульсуючыя праблемныя кропкі ў раёнах сваёй выбарчай акругі, трымаць руку на іх пульсе і вырашаць наспелыя пытанні разам з рэгіянальнымі органамі ўлады і мясцовымі жыхарамі. Вельмі важна бачыць мясцовыя магчымасці і рэсурсы і прыводзіць іх у дзеянне, каб жыццё жыхароў акругі паляпшалася.

**— Гэта ключ да рэпутацыі дэпутата?**

— Можна сказаць і так. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў імкнуцца пастаянна трымаць у фокусе ўвагі інтарэсы сваіх рэгіёнаў і выбаршчыкаў. Таму ёсць і станоўчы вынік і эканамічны, і сацыяльнага характару.

**— Як вы лічыце, чаго не павінна быць у дэпутацкай рабоце?**

— Абстрактнага падыходу да чалавека і адарванасці ад палітычнай рэальнасці.

**— Ведаю па водгуках, што жыхары Докшыцкай выбарчай акругі № 22, ад якой вы выбраны дэпутатам парламента, успрымаюць вашы рабочыя прыезды як прыезды свайго чалавека, які вельмі многа зрабіў і робіць для акругі і людзей. Можаце сказаць хоць бы канспектыўна пра асноўнае, што зроблена вамі за мінулы год?**

— Займаюся рознымі сацыяльна-эканамічнымі пытаннямі сумесна з кіраўніцтвам Глыбоцкага, Докшыцкага і Ушацкага раёнаў. Гэта будаўніцтва, мадэрнізацыя, капітальны і бягучы рамонт, прыцягненне інвестыцый у асабліва значныя вытворчыя і сацыяльныя праекты, добраўпарадкаванне тэрыторый і іншае. Вырашаю па меры магчымасці і канкрэтныя просьбы грамадзян, якія прыходзяць на мае дэпутацкія прыёмы, звяртаюцца з вуснымі і пісьмовымі зваротамі. Словам, будзённая дэпутацкая работа, як і ў маіх калег. Мы ўсе настроены на тое, каб наша заканадаўчая дзейнасць і праца ў выбарчых акругах прыносілі карысць простаму чалавеку. На сваім вопыце пераканаўся: калі ставішся да людзей з разуменнем і адкрытым сэрцам, то так яны ставяцца і да дэпутата.

**— Уладзімір Паўлавіч, што вы пажадаеце новаму складу мясцовых Саветаў, які будзе выбраны 18 лютага?**

— Лёгкасці на пад'ём у вырашэнні задач, якія стаяць перад мясцовымі Саветамі, і актыўнай работы на практычны вынік, каб 2018 год, аб'яўлены Годам малой радзімы, прынёс добры плён рэгіёнам і тэрыторыям. Гэта ў нашых агульных інтарэсах. У інтарэсах краіны.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

## Пабачыць футбольны трафей

**Кубак свету ФІФА ўчора прыбыў з Вены ў Мінск. Спачатку ён быў прадстаўлены гасцям Палаца Незалежнасці, а затым выстаўлены ў спартыўна-забаўляльным комплексе Falcon Club. Ва ўрачыстасці ў Палацы ўдзел узялі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і прадстаўнік ФІФА Лукас Рахаў. Сярод гасцей былі юныя беларускія футбалісты, трэнеры, прадстаўнікі футбольнай грамадскасці, пераможцы і прызёры Алімпійскіх гульняў, спартыўныя функцыянеры.**

Пасля памятнага фатаграфавання гаворка ішла ў асноўным аб стане спраў у беларускім футболе. Пра сваё бачанне праблем у гэтай сферы кіраўніку дзяржавы расказаў заслужаны трэнер СССР і Беларусі Эдуард Малафееў, пасля чаго Прэзідэнтам былі дадзены адпаведныя даручэнні. Таксама беларускі лідар не абышоў у размове са спартсменамі выступленне беларускіх атлетаў у Пхёнчхане на зімовых Алімпійскіх гульнях.

На заканчэнне мерапрыемства Лукас Рахаў уручыў Аляксандру Лукашэнку паменшаную копію Кубка. А яго арыгінал з Мінска мусіць адправіцца ў Сафію.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

■ Алімпіяда-2018

# Яшчэ ўчора ён паміраў, а сёння выйграў медаль

**У дайджэсце «Звязды» збіраем самыя цікавыя навіны з Карэі і расказваем пра тое, што застаецца за кадрам спаборніцтваў.**



Канадзец Марк Макморыс заваяваў «бронзу» Алімпіяды-2018 у слоўпстайле. У сакавіку 2017 года пасля падзення на адным з турніраў спартсмен зламаў сабе сківіцу, левую руку, некалькі рэбраў і таз, разарваў селязёнку і пашкодзіў лёгкае. Праз дзве гадзіны ў бальніцы Ванкувера ўрачы з цяжкасцю вярнулі яго да жыцця.

Пасля гэтага Марк месяц праляжаў у ложку. *«Яму было нязручна сядзець, нязручна стаяць, нязручна спаць. Ён не мог самастойна паесці, рукі проста не фіксаваліся каля рота — настолькі ўсё было знявечана»*, — расказваў фізіятэрапеўт Дэм'ен Мароні. Праз 8 месяцаў пасля падзення Макморыс выйграў этап Кубка свету ў Кітаі. *«Тое, што зрабіў мой арганізм, — сапраўднае вар'яцтва. Я рыхтаваўся да смерці. Пасля таго выпадку ні адзін дзень на гэтай зямлі я не прыму як сам сабой зразумелы»*, — сказаў тады спартсмен.

У Пхёнчхане Макморыс выйграў другую алімпійскую «бронзу» запар. За пару тыдняў да Гульняў-2014 ён зламаў рабро, але ўсё роўна стаў трэцім у Сочы.

## Стадыён на месяц

Галоўны стадыён Алімпіяды-2018, дзе ўжо прайшла цырымонія адкрыцця Гульняў, разбяруць адразу пасля заканчэння Параалімпіяды ў сакавіку гэтага года. Нагадаем, арэна разлічана на 35 тысяч месцаў і была дабудавана толькі ўвосені 2017-га. Планавецца, што на яе месцы ў цэнтры Пхёнчхана з'явіцца музей і іншыя месцы для забавы. Спачатку арганізатары планавалі правесці цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпійскіх гульняў на вялікім стадыёне ў адным з найбліжэйшых гарадоў, але жыхары Пхёнчхана не падтрымалі гэтую ідэю. Такім чынам, бюджэт Алімпіяды-2018 вырас да 12,4 мільярда долараў — гэта ў паўтара раза больш за суму, якую прагназаваў Сеул у 2011-м, калі карэйская заяўка перамагла.

Адзначым, што з алімпійскіх аб'ектамі такія трансфармацыі адбываюцца часта, напрыклад, стадыён «Фішт» у Сочы, на якім праходзілі цырымоніі адкрыцця і закрыцця Алімпіяды-2014, у першапачатковым выглядзе больш ніколі не выкарыстоўваўся. Да чэмпіянату свету па футболе яго рэканструявалі, і ранейшай засталася толькі назва.

## Мексіка здзіўляе



Мексіканцы наўрад ці будуць здзіўляць аматараў спорту сваімі перамогамі або нечаканымі спартыўнымі вынікамі. Краіна прадстаўлена ўсяго ў трох дысцыплінах лыжнага спорту — горных лыжах, лыжных гонках і фрыстайле. Але яе прадстаўнікі вырашылі браць іншым — касцюмамі.

## Беларусы ў чацвёрты дзень Алімпіяды

У аўторак нашы спартсмены прынялі ўдзел у спаборніцтвах па горных лыжах і лыжных гонках. Юрый Данілачкін выступіў у гарналыжнай камбінацыі, якая ўключае ў сябе хуткасны спуск і слалам. Беларус прайшоў дыстанцыю па хуткаснам спуску на лыжах за 1 хв. 22,78 сек., фінішаваўшы 47-м. У слаламе гарналыжнік паказаў час 55,94 і заняў у выніку 34-е месца.

Лыжніцы Юлія Ціханава, Настасся Кірылава, Паліна Серанасава і Валянціна Камінская завяршылі барацьбу ў спрынце класічным стылем на стадыі кваліфікацыі. Аляксандр Воранаў у такім жа відзе праграмы дабраўся да чвэрцьфіналу.

Сёння беларусы прымуць удзел у спаборніцтвах па біятлоне (індывідуальная гонка ў жанчын) і гарналыжным спорце (жаночы слалам).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ХОЛДЫНГ ПРЫРАСТАЕ РАСІЯЙ

**Глыбокая тэхналагічная мадэрнізацыя вытворчасці ажыццёўлена за апошнія гады ў ЗАТ «Амкадор-Пінск», яно ўваходзіць у холдынг «АМКАДОР» і з'яўляецца адным з вядучых вытворцаў дарожна-будаўнічай тэхнікі ў нашай краіне і СНД.**

Асаблівасць прадпрыемства — мабільнасць вытворчасці, якая дазваляе хутка дыверсіфікаваць сегменты тэхнікі, якая выпускаецца, а таксама вялікая наменклатура выпускаемых вырабаў і яе пастаяннае абнаўленне. А шматпрофільнасць дапамагае стабільна працаваць нават пры часовым зніжэнні аб'ёмаў продажу асобных відаў прадукцыі.

Новыя цэхі прадпрыемства, якое на працягу трох гадоў перамагае ў конкурсе «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынках Расійскай Федэрацыі», сталі працоўным месцам больш чым 60 кіраўнікоў дыстрыб'ютарскіх і дылерскіх кампаній холдынга «АМКАДОР», якія працуюць у суседняй Расіі. З удзелам старшыні савета дырэктараў холдынга Аляксандра Шакуціна выпрацавана стратэгія далейшай работы таваpаправоднай сеткі прамысловага гіганта ў расійскіх рэгіёнах.

На тэрыторыі завода «Дармаш» людзі, ад якіх шмат у чым залежыць паспяховасць беларускага экспарту, пазнаёміліся з выстаўкай шматлікіх навінак тэхнікі холдынга «АМКАДОР», з іх несумненнымі канкурэнтнымі перавагамі.

**Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**

## ГАСПАДАР ЖЫЛЛЯ ЗАГІНУЎ

**На пажары ў Клецкім раёне выратаваны тры чалавекі, яшчэ 11 былі эвакуяваны.**

— Бліжэй да вечара паступіла паведамленне пра загаранне ў шматкватэрным жылым доме ў аграгарадку Янавічы. На месцы падраздзяленні ўбачылі моцнае задымленне ў жыллі на другім паверсе трохпавярховага дома, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Тут у пакоі знайшлі загінулага гаспадара 1973 года нараджэння. Па словах суседзяў, мужчына пражываў адзін.

З вышэйразмешчанай кватэры па лесвіцы работнікі МНС выратавалі жанчыну 1994 года нараджэння і яе сына 2014 года нараджэння. З гэтага ж жылля пры дапамозе маскі вывелі па лесвічных маршах пенсіянерку 1951 года нараджэння. З суседніх кватэр ратавальнікі эвакуявалі 11 чалавек. Прычына пажару ўстанаўліваецца. Версія, якая разглядаецца, — неасцярожнасць пры курэнні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «СПЕЦАВТОМАТИКА» | | |
|---|---|---|
| **Предмет торгов** | **Начальная цена** | **Размер задатка** |
| Лот № 1. Изолированное помещение (инв. № 130/D-58582) – однокомнатная квартира, пл. 55,2 кв. м, расположенная по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Ровецкая, 8-11 | 59 130,68 рублей | 1560,00 рублей |
| **Условия продажи** | Без условий | |
| **Организатор торгов** | Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, УНП 201028245, BIC Банка BPSBBY2X | |
| **Аукцион состоится 28 февраля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325** | | |
| **Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52** | | |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00** | | |
| **Последний день приема заявлений – 27 февраля 2018 г. до 17.00** | | |


## АД АДКАЗНАСЦІ НЕ СЫШОЎ

**29-гадовы бабруйчанін расправіўся з маці сужыцелькі, а яе саму прымушаў павесіцца.**

У канцы верасня мінулага года малады чалавек наведаўся да маці сваёй грамадзянскай жонкі, пасварыўся з ёй і жорстка збіў яе рукамі, нагамі, а таксама рознымі прадметамі, што былі побач, а потым задушыў. Каб схаваць сляды злачынства, ён накінуў на цела жанчыны куртку, а зверху тлеючы недакурак. Але сысці ад адказнасці не атрымалася.

— Як высветліла следства, абвінавачаны пастаянна здзекаваўся з жанчыны і дзвюх яе дачок, неаднаразова выказваючы ў іх адрас пагрозы аб фізічнай расправе, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Магілёўскай вобласці Аксана САЛЯНЮК.** — Аднойчы пагражаў адной з дачок сякерай, абяцаючы яе забіць. А сваю сужыцельку прымусіў залезці на дрэва і засунуць галаву ў падрыхтаваную ім пятлю. Пацярпелая была ў такім стрэсавым стане, што пайшла на самагубства. Але вяроўка абарвалася і жанчына засталася жывая.

Бабруйчаніну прад'яўлена абвінавачанне ў здзяйсненні злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 154, 186 (частка 1), 145 (1), 139 (1),14 (1) і 218 (3) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. У рамках крымінальнай справы праведзены дзясяткі судовых экспертыз, у тым ліку псіхолага-псіхіятрычная. Выяўлена, што абвінавачаны па псіхічных расстройствы ў момант здзяйснення злачынства не пакутаваў, мог у поўнай меры ўсведамляць характар сваіх дзеянняў і кіраваць імі. Крымінальная справа вывучана пракурорам і накіравана ў суд. Абвінавачваны застаецца пад вартай. Максімальнае пакаранне, якое яму пагражае, прадугледжвае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ЗДАРЭННЕ НА ЗАВОДЗЕ

**Несумяшчальныя з жыццём траўмы 37-гадовая лабарантка ААТ «Торфабрыкетны завод Лідскі» атрымала пры правядзенні фізіка-механічных выпрабаванняў трываласці брыкету.**

Як паведаміла ўпраўленне Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці, устаноўлена, што жанчына, якая атрымала цялесныя пашкоджанні, выконвала свае абавязкі з выкарыстаннем механічнай устаноўкі, якая не адпавядала патрабаванням бяспекі. Гэта прывяло да таго, што адзенне жанчыны зачапілася за абсталяванне, яна была траўмавамая сталёвым барабанам. Вострая страта крыві і траўматычны шок прывялі да смерці.

Па факце парушэння правілаў аховы працы, што прывяло да смерці чалавека па неасцярожнасці, распачата крымінальная справа. Падазраваным у здзяйсненні злачынства прызнаны 27-гадовы майстар змены брыкетнага цэха.

Канчатковая прававая ацэнка будзе дадзена па выніках расследавання крымінальнай справы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


ООО «ГИРИЗ»

**ГИДРАВЛИКА:** гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
**ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ**
Самые конкурентные цены
**В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА**
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
**ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ, ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.**
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
**girza.by**
УНП 691586696


# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ДА 2050-га Ў СВЕЦЕ ТРЭБА СТВАРЫЦЬ ДАДАТКОВА 300 МЛН ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ



Пра гэта заявіў у Дубаі прэзідэнт Сусветнага банка (СБ) Джым Ён Кім, выступаючы на VI Сусветным урадавым саміце, прысвечаным пытанням эфектыўнага дзяржаўнага кіравання і ўкаранення сучасных тэхналогій у розныя сферы жыцця. У прэстыжным мерапрыемстве прымаюць удзел больш за 4 тысячы дэлегатаў са 140 краін. На словах кіраўніка СБ, «усе краіны свету павінны быць гатовыя канкурыраваць у эканоміцы будучыні». «Да 2050 года 150 млн чалавек пакінуць рынак рабочай сілы, а 450 млн увойдуць у яго. Гэта значыць, што з'явіцца разрыў у 300 млн працоўных месцаў, якія неабходна стварыць», — падкрэсліў Джым Ён Кім. «Прафесіі будучыні будуць самымі рознымі, а інавацыі будуць рухацца наперад», — адзначыў ён, сказаўшы ў гэтай сувязі пра «важнасць інвеставання ў адукацыйную сістэму».

## МАЙНІНГ БІТКОЙНАЎ МОЖА ПРЫВЕСЦІ ДА НЕДАХОПУ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ Ў ІСЛАНДЫІ

Майнінг біткойнаў у Ісландыі ўвайшоў у стадыю росту, і на гэтую дзейнасць ідзе ўсё больш і больш энергарэсурсаў краіны, заявіў прадстаўнік мясцовай энергетычнай кампаніі HS Orka. Сёлета спажыванне электрычнасці цэнтрамі майнінгу, хутчэй за ўсё, перавысіць спажыванне энергіі ўсяго насельніцтва, сказаў Ёхан Снорэ Сігурбергсан. Паводле яго слоў, усё больш людзей хочуць займацца гэтай дзейнасцю. «Калі ўсе такія праекты будуць рэалізаваны, у нас не хопіць электраэнергіі», — сказаў ён у інтэрв'ю BBC. У Ісландыі жывуць усяго каля 340 тысяч чалавек. Амаль 100 % электраэнергіі гэтай краіны паступае з аднаўляльных — часта геатэрмальных — крыніц.

## ЛЬВЫ Ў ПАЎДНЁВАЙ АФРЫЦЫ З'ЕЛІ БРАКАНЬЕРА



Гэта адбылося ў ваколіцах Нацыянальнага парку Крюгера. «Падобна на тое, што ахвяра займалася незаконным паляваннем у сафары-парку, дзе на яго напалі і разарвалі львы, — паведаміў інфармагенцтву France-Presse прэс-сакратар паліцыі Лімпапо Моатэ Нгопэ. — Яны з'елі яго амаль цалкам, пакінуўшы толькі галаву і нейкія некаторыя фрагменты». Паліцыя яшчэ не ўстанавіла асобу ахвяры. Побач з целам былі выяўлены зараджаная паляўнічая стрэльба і боепрыпасы, паведаміў навінавы паўднёваафрыканскі сайт. Дарэчы, у апошнія гады ў правінцыі Лімпапо пачасціліся выпадкі незаконнага палявання на львоў. Часткі цела буйных кацiных часам ужываюцца ў традыцыйнай медыцыне як у Афрыцы, так і за яе межамі.

# Уранавы сардэчнік...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Магутных безгаспадарчых крыніц, якія пагражалі б жыццю чалавека пры кароткім узаемадзеянні, у Беларусі не было ўжо гадоў 10. Яны цяпер усе знаходзяцца пад жорсткім кантролем і перыядычна правяраюцца. Увогуле, чалавек бяспечна для сябе можа атрымаць ад натуральных крыніц 2 мілізіверты на год, яшчэ 1 — ад штучных.

— Калі чалавек убачыў кантэйнер з маркіроўкай «Радыяцыйная небяспека» і патэлефанаваў па нумары 101, то мы абавязаны выехаць на месца, — працягвае Васіль Шалепін. — Але гэта адзінкавыя выпадкі, і з высокай доляй верагоднасці гэта будзе невялікая крыніца, выкінутая з лабараторыі неахайным супрацоўнікам. Акрамя аэрапорта, нас часта выклікаюць у Гатава — там, дзе прымаюць металалом. Чаго мы там толькі не знаходзілі! Партальныя маніторы спрацоўвалі на капсулы з лабараторый, тарыраваны вальфрам, а аднойчы знайшлі нават... уранавы сардэчнік. Праўда, палохацца не трэба — ён быў зроблены з абедненага ўрану, які валодае вельмі нізкай радыеактыўнасцю.

## ГАДЗІННІК З СЮРПРЫЗАМ

У перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі радый лічыўся ледзь не ўніверсальным памочнікам ва ўсіх сферах. Яго дабаўлялі ў ваду, у прадукты харчавання, фарбай з солямі радыю пакрывалі стрэлкі гадзіннікаў, каб тыя свяціліся ў цемры — электронных прыбораў з падсветкай тады яшчэ не вынайшлі. Але мінула колькі часу, і аказалася, што радый не такі ўжо і бяскшодны, як гэта ўяўлялася раней. Таму выкарыстанне яго хімічных злучэнняў у побытавай сферы паціху згарнулі. Аднак справа адным толькі радыем не абмяжоўвалася. Напрыклад, старое шкло, якое прыгожа свеціцца зялёным святлом, хутчэй за ўсё змяшчае ў сабе ўран. Ды і дзясяткі тысяч выпушчаных раней прадметаў нікуды не падзеліся.

— Мы аднойчы прыехалі да адной бабулі праверыць гадзіннік, які ёй прывёз муж у той час, калі служыў на флоце, — успамінае Васіль Шалепін. — Гадзіннік спакойна стаяў сабе дзесяцігоддзямі на паліцы. Бабуля недзе пачула, што прылада можа змяшчаць радый. І на ўсякі выпадак папрасіла нас зрабіць дакладныя замеры. Аказалася, што перавышэнне прыроднага фону было, але на адлегласці да аднаго метра. Таму можна сказаць, што бабулі пашанцавала, што той гадзіннік стаяў даволі далёка ад ложка ў шафе. Аднак усё роўна мы адправілі яго на захаванне на прадпрыемства, якое займаецца перапрацоўкай другасных рэсурсаў. Справа ў тым, што на сёння не вынайдзена тэхналогіі перапрацоўкі радыенуклідаў у бяспечныя ізатопы. Таму яны і здаюцца на доўгачасовае захаванне ў спадзяванні на тое, што нашчадкі вынайдуць нейкі спосаб з імі разабрацца. Бо ў прыродзе перыяд паўраспаду радыю складае больш за 1600 гадоў.

## ЯК КІРОЎЦА ЗГУБІЎ ПАЎТОНЫ ШЧОЛАЧЫ

— Што да небяспечных хімічных рэчываў, то, як правіла, большасць праблем з імі адбываецца пры транспарціроўцы, — кажа Васіль Шалепін. — Недзе нешта недакруцілі, ці ДТЗ адбылося — і ёмістасць разгерметызавалася. Аднойчы нас выклікалі на фуру, якая везла кубавыя ёмістасці з канцэнтраванай шчолачу. Адна з іх працякла, а кіроўца заўважыў, што нешта не так, толькі тады, калі выцекла прыкладна каля паўтоны шчолачы. Небяспека яе ў тым, што яна раз'ядае скуру чалавека, але ён гэтага не адчувае. Боль пачнецца, калі эпідэрміс ужо не будзе. Зрэшты, у той гісторыі ўсё скончылася добра.

Ці вось прыгадаем нашумелы выпадак з разлітым бромам у Мінску. Ён наогул нейкі загадкавы. Гаспадар, замест таго каб выклікаць нас, паліччыў за лепшае... заклеіць хуценька дзверы на кухні, каб па кватэры не распаўсюджваўся вельмі непрыемны пах. У рэшце рэшт ратавальнікаў выклікалі суседзі...

## РАЗЛІТАЯ РТУЦЬ — «РЭХА» 1990-Х ГАДОЎ

Беларусь падпісала Канвенцыю Мінамата, якая з 2020 года вельмі істотна абмяжуе вытворчасць прадукцыі, што ўтрымлівае ртуць. Але з атрутнай спадчынай давядзецца мець справу яшчэ не адзін год — нават не палічыць, колькі было рэалізавана адных толькі медыцынскіх тэрмометраў. А калісьці без вадкага металу не абыходзіліся нават барометры — не забудзем, атмасферны ціск вымяраецца і дагэтуль у міліметрах ртутнага слупка. Таксама нярэдкія выпадкі, калі ртуць знаходзяць у колькасці яўна большай за тую, што ўтрымліваецца ў тэрмометрах. Напрыклад, два месяцы таму ў Рэчыцы невядомы разліў 250 грамаў ртуці каля помніка. Адкуль жа яна бярэцца ў такіх аб'ёмах?

— Гэта «рэха» 1990-х гадоў, калі нехта запусціў пагалоску, што ртуць можна выгадна збыць за мяжу, — мяркуе Васіль Шалепін. — Людзі старэйшага пакалення таксама ўспамінаюць гісторыі пра «чырвоную ртуць», якая нібыта каштуе вельмі дорага, але насамрэч у прыродзе існуе. Вось і панеслі з прадпрыемстваў вадкі метал да сябе дадому, каб на ім нажыцца. Але чуткі як прыйшлі, так і сышлі, а ртуць на руках засталася. Мы збіралі за раз і па тры кілаграмы вадкага металу, і па пяць... Але адметна, што нідзе не было новых ёмістасцяў, маркіроўка на іх была выключна савецкая. Колькі яшчэ такіх «сюрпрызаў» ляжыць у беларускіх дамах, падлічыць немагчыма. Аднойчы мы выехалі ў інтэрнат, дзе знаходзіўся балон з надпісам «Аксістыбат ртуці». Вельмі небяспечнае рэчыва: нават у вельмі малой канцэнтрацыі яно выклікае камбінаванае атручэнне, бо ў яго склад уваходзяць ртуць і сурма. А вось большасць выездаў «на тэрмометры» ў нас пачынаецца пасля 19 гадзін. Яно і зразумела — людзі прыйшлі з работы, узялі неахайна крохкі прыбор, ён зваліўся і раскалоўся.

Што ж рабіць у такім выпадку? Перш за ўсё, трэба ўсіх асцярожна вывесці з памяшкання і сачыць за тым, каб ніхто не наступіў на бліскучыя кроплі. Пасля гэтага адчыніць акно, каб максімальна праветрыць пакой, і зачыніць у яго дзверы. Далей неабходна правесці работы па самастойнай уборцы ртуці з дапамогай падручных сродкаў. Пасля заканчэння работ трэба звярнуцца ў рэгіянальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі ў мэтах вызначэння наяўнасці канцэнтрацыі пары ртуці ў паветры памяшкання.

Калі ртуць трапіла на вопратку, неабходна сабраць з яе бачныя кроплі, вытрасці тканіну на вуліцы і здаць у хімчыстку. Падрабязная інструкцыя па самастойнай уборцы ртуці размешчана па адрасе http://mchs.gov.by/pravila/pri_obnaruz_rtuti.pdf або ў мабільнай праграме «МЧС: Помощь рядом». Здаць прыбор, які змяшчае ртуць, вы можаце ў найбліжэйшую пажарную аварыйна-выратавальную часць.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**




# СНЕГ З-ПАД КАНЬКОЎ ПАД КАРНАВАЛЬНЫЯ РЫТМЫ

## У Белдзяржцырк завітала «Лядовая феерыя»

**ВІДОВІШЧА прывезлі артысты Маскоўскага «Цырка на лёдзе» — штатнага падраздзялення знакамітага цырка Нікуліна на Цвятным бульвары. Як няцяжка здагадацца, усе выступоўцы ад клоўнаў да эквілібрыстаў, ад дрэсіроўшчыкаў да паветраных гімнастаў выконваюць нумары «не сыходзячы з ляза».**

**Наталля АБРАМАВА, дырэктар калектыву і заслужаны работнік культуры Расійскай Федэрацыі** прызналася, што правільна заліць лёд на цыркавы манеж яшчэ трэба ўмець. Калі гаварыць зусім проста, то лядовая арэна працуе «па прынцыпе халадзільніка», аднак прыдатнае для выступлення пакрыццё залежыць ад мноства акалічнасцяў: уплывае як пара года, так і падача электраэнергіі, якую можа забяспечыць цырк. Мінскі лёд гасцям спадабаўся — гладкі, моцны, цалкам прыдатны, каб на ім катацца.

— Мы маглі б пайсці лёгкім шляхам і закрыць арэну пластыкам. Але гэта зусім не той эфект і хутказь, як на сапраўдным лёдзе. Так што вырашылі зрабіць «усё па сапраўднаму», хоць і хваляваліся за вынік, — успамінае **дырэктар Белдзяржцырка Уладзімір ШАБАН.** — Пад ільдом на арэне пракладзена мноства маленькіх трубачак, якія падтрымліваюць холад. Зверху разаслана палатно, каб для гледачоў паверхня была не празрыстая, а белая, і ўжо над ім зноў замарожаны слой вады. Скажу шчыра, у мяне сэрца сціскалася на нумарах з гірамі. Асабліва, калі артыст упускае такі цяжар на дол.

З выступленнямі на каньках цыркавыя артысты аб'ехалі 38 краін. На пластыкавае пакрыццё майстры лядовай феерыі станавіліся толькі каб сустрэцца з гледачамі ў Інданезіі, Амане, Турцыі — краінах, дзе гарача нават зімой. У Беларусі калектыў затрымаецца да 29 красавіка.

Нягледзячы на тое, што з-пад ног ляціць снежная крошка, нумары захопліваюць яркімі фарбамі і гарачымі рытмамі. Гледачоў нібы запрашаюць у падарожжа па краінах свету з прыпынкамі то на бразільскім карнавале, то на Паўночным полюсе. Дарэчы, чатырохногія гадаванцы Максіма Рубцова сапраўды нагадваюць пухнатыя снежныя гурбы. Акрамя сабак на манеж выйдуць дрэсіраваныя малпачкі і мядзведзі. Толькі замест класічнага веласіпеда касалапы перасеў на гіраскутар. **Надзея КРУПСКАЯ, кіраўнік нумара,** расказала, што атрымалася гэта амаль выпадкова:

— Нейкі час у нас многа хто захапляўся гіраскутарамі. І якраз было медзведзяня, якому вырашылі прапанаваць пакатацца ў якасці гульні. Аказалася, што з гэтага вырасце новы трук. Прызнацца шчыра — я стала на хітрую тэхніку з дзясятага разу, а вось мішка асвоіў забаўку на трэці падыход.

Адно з самых незвычайных выступленняў праграмы — нумар пад кіраўніцтвам Дар'і Абрамавай. У сваіх касцюмах дзяўчаты падобныя ці то на жывыя кветкі, ці то на райскіх птушак. Поры года змяняюць адна адну з захапляльнай грацыяй і сінхроннасцю. Канькі-хадулі толькі дабаўляюць фантастычнасці дзейству.

— Вышыня канструкцыі складае 60 сантыметраў. Мы іх замаўлялі спецыяльна для выступленняў. Я папрасіла змяніць дызайн апоры, бо спачатку гэта былі прамыя металічныя «палкі». Мне ж хацелася неяк прывязаць афармленне канькоў да незвычайных касцюмаў, — кажа Наталля Абрамава.

У Веніяміна Ігумнава, кіраўніка нумара «Дрэсіраваныя папугаі», існуе свая гісторыя адносін з ільдом:

— Якім чынам стаў катацца? — усміхаецца ён. — Ды вельмі проста! Я напалову беларус, мае бабуля і дзядуля з-пад Бабруйска. «Хочаш на радзіму?» — спыталі ў мяне. «Хачу!» «Тады станавіся на канькі».

І сапраўды, як расказвае дырэктар калектыву Наталля Абрамава, няма такой установы, дзе б дрэсіроўшчыка альбо акрабата вучылі адначасова і выступаць, і катацца. У «Цырк на лёдзе» артысты трапляюць двума шляхамі. Альбо прыходзяць людзі з фігурнага катання і далучаюць да цыркавога майстэрства, альбо «давучваюць» прафесійных цыркавых артыстаў.

Зрабіць трайное сальта, падскочыць вышэй галавы на каньках даволі цяжка. Між тым у праграме, па словах Уладзіміра Шабана, хацелася прадставіць усе цыркавыя жанры. Так што пры ўсёй нечаканасці выступленне акрабатаў на дарожцы гарманічна ўпісалася ў імклівы рух «Лядовай феерыі». А вось для ўдзельнікаў нумароў з манацыкламі і рэнскімі коламі тонкае лязо на нагах не аказалася перашкодай. Для гэтых людзей праехаць у каньках на веласіпедзе — цалкам пасільная задачка!

У сваіх выступленнях расійскія артысты зрабілі акцэнт на відовішчнасць і эмацыянальнасць, глядач убачыць як кранальныя адзіночныя выступленні, так і масавыя выхады на лёд, дзе ўсё ўражанне залежыць ад сінхроннасці выканання. Ужо на першыя выхадныя білеты былі поўнасцю раскуплены, а на будучыню цырк абяцае такія ж захапляльныя праграмы.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА**



# «Завезлі Дзеда за сяло, і ўсім стала весяло...»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стр.)*

Як заўсёды, асноўны ўдзел у народных масленічных гуляннях прымаюць жанчыны.

Гэтым разам у Даўгаполлі «хаўтуры» праводзілі ў хаце Валянціны Шандзялёвай. Валіны суседкі дапамаглі гаспадыні зрабіць саламянага дзеда, якога на час ігрышча ў вёсцы называюць Цімафеем Васілевічам. Чаму так называюць? А ўсё таму, што некалі тут жыў адзін вясёлы і бесклапотны дзед, які не даваў праходу вясковым прыгажуням, заляцаўся да іх. Таму вобраз «Дзеда», якому было амаль сто гадоў, застаўся ў народнай памяці і дагэтуль.

У першы дзень масленічнага тыдня ў Валінай хаце, па абедзе, збіраюцца вяскоўцы на развітанне з «Дзедам», паглядзець і паслухаць, як галосіць і прычытае «ўдава». Тая стараецца рабіць гэта як мага больш красамоўна і дасціпна — каб «хаўтуры» атрымаліся запамінальныя і вясёлыя. Жанчыны таксама далучаюцца да вясёлага тэатральнага дзейства, жартаўліва і «салёна» успамінаюць Дзедавы выбрыкі. І ў той жа час не забываюць пахваліць Цімафея Васілевіча за яго «працавітасць» і «працаздольнасць», «геройскія» ўчынкі, прабачаюць яму. Жанчыны пераапранаюцца то ў «доктара», які засведчыць «смерць» Дзеда, то ў «святара», які спраўляе паніхіду. А потым вясёлым натоўпам праводзяць «Васілевіча» за сяло. Вяртаючыся дадому, «удава» спявае: «Завезлі Дзеда за сяло, і ўсім стала весяло...»

У хаце ўжо накрыты «памінальны» стол, гарманісты дастаюць свае гармонікі, і пачынаюцца вясёлыя «памінкі».

Кажуць, сучаснаму чалавеку не дадзена да канца зразумець, які сэнс укладвалі нашы продкі ў гэтае ігрышча. Гульня папярэднічала важнай падзеі земляробчага календара селяніна — Вялікаму посту, таму трэба было добра павесяліцца. І ў той жа час абрад даваў разуменне, што ўсё ў гэтым свеце часова і што паміранне павінна ўспрымацца як неабходны працяг існавання і сімвал адраджэння зямлі.

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**

*Гарадоцкі раён, вёска Даўгаполле.*



**Гарадоцкі народны масленічны абрад унесены ў спіс аб'ектаў нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Арганізатары мерапрыемства — аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама, а таксама цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці раёна.**







# БЛІНЫ Ў МІРСКІМ ЗАМКУ

**Першы дзень Масленічнага тыдня завецца «Сустрэча». У гэты дзень пяклі бліны, прывячалі гасцей і майстравалі з саломы пудзіла Масленіцы, якое вазілі ў санях па вуліцах. У гістарычным дворыку Мірскага замка ў Карэліцкім раёне таксама адзначылі першы дзень свята Масленіцы.**



Адпаведна традыцыям пачалося яно адвошным і каларытным шэсцем з калядной зоркай, калядоўшчыкамі, песнямі ды жартамі. Наперадзе святочнай працэсіі ў запрэжаных санях ехалі Зіма з Вясною ды пудзіла Масленіцы.

Па дарозе скамарохі ды калядоўшчыкі (супрацоўнікі раённага Дома культуры і бібліятэкі) прапаноўвалі ўсім сустрэчным піражкі ды ледзянцы ўласнага прыгатавання. А само гулянне пачалося ва ўнутраным дворыку Мірскага замка.

Госці маглі не толькі пачаставацца гарачымі аладкамі ды гарбатай, але і паўдзельнічаць у зімовай рыбалцы, злавіўшы на вуду карысны прыз. Або звязаць масленічную лялькуабярэг.

— Па традыцыі яе звязвалі і ў той жа дзень палілі разам з усімі клопатамі і бедамі. Аднак нашы госці забяруць яе на памяць пра свята, — расказалі дзяўчаты з **Карэліцкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.**

— Музей не стаіць убаку ад народных традыцый. Нельга сказаць, што мы іх развіваем, хутчэй, падтрымліваем. Масленічны тыдзень беларусы заўжды добра ладзілі. Вельмі прыемна, што святкаванні пачаліся на тэрыторыі замка, што было нечакана для многіх наведвальнікаў, — падзяліўся ўражаннямі **Аляксандр ЛОЙКА, дырэктар замкавага комплексу «Мір».** — Мы спадзяёмся, што свята прыжывецца ў музейным комплексе і стане адметнай тут традыцыйна. Масленічны тыдзень мы таксама скончым у суботу ў нашым унутраным дворыку выступленнем артыстаў з розных раёнаў Гродзенскай вобласці.

Свята, безумоўна, удалося, і ўспамін пра яго застанецца не толькі ў наведвальнікаў, але і ў тых, каго побач не было. Турысты са стажам — мама Таццяна, тата Іван, дзеці Сцяпан і Сафія і бабуля Таня — прыехалі паздымаць зімовы замак і выпадкова трапілі на свята. Прыемныя ўражанні ў здымках і відэа адразу пачалі адсылаць сваякам за мяжу:

— Замест таго каб у Мінску ў кватэры сядзець і ў лепшым выпадку на санках выйсці пакатацца, лепш падарожнічаць. Тым больш што мы гэта любім, а яшчэ і снег нарэшце выпаў. А тут такі нечаканы святочны падарунак...



Паміж Карэліцкім райвыканкамам і Мірскім замкам атрымліваецца добры тандэм. **Іна САНЧУК, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Карэліцкага райвыканкама,** заўважае:

— Мы хочам, каб пэўныя святы асацыяваліся ў людзей з канкрэтным месцам і яны ведалі, што і наступным годам можна наведацца сюды на мерапрыемства. У Мірскім замку, спадзяёмся, прыжывецца Масленіца, у Цырыне ў нас Мядовы Спас, у Жухавічах — Яблычны, у Ярэмічах — свята дранікаў.



«Звязда» таксама далучылася да агульнага гуляння і падтрымлівала настрой, дорачы ўсім ахвотным сцяжкі ды паветраныя шарыкі.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

## Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельного участка на право заключения договора аренды

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | Аукцион состоится **16 марта 2018 года в 11.00** по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45.<br>Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» |
| 2 | Срок приема документов | **С 9.00 до 17.00 по рабочим дням по 14 марта 2018 года** |
| 3 | Номер лота | 1 |
| 4 | Адрес земельного участка | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Первомайская (остановка «Международная») |
| 5 | Кадастровый номер участка | 321850100001003381 |
| 6 | Площадь, га | 0,0056 |
| 7 | Целевое назначение | земельный участок для строительства и обслуживания торгового павильона, совмещенного с остановочным навесом (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) |
| 8 | Срок аренды | 10 (десять) лет |
| 9 | Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений и сооружений; инженерно-геологические условия | Участок свободен от застройки (инженерно – геологические условия будут определены на стадии производства проектно – изыскательских работ) |
| 10 | Условия и ограничения | Земельный участок предоставляется для проведения аукциона на право заключения договора аренды с условиями:<br>в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;<br>после совершения победителем аукциона, либо единственным участником несостоявшегося аукциона названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с Жлобинским районным исполнительным комитетом (далее – райисполком) договор аренды земельного участка и обеспечить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды государственную регистрацию права аренды на земельный участок;<br>в течение двух месяцев, со дня государственной регистрации права аренды земельного участка, получить в уставленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку проекта благоустройства территории;<br>приступить к строительству объекта в течение шести месяцев, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;<br>снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации;<br>завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;<br>по окончании срока аренды земельного участка, но не позднее срока, установленного настоящим решением обратиться в райисполком для решения вопроса о его дальнейшем использовании или продлить срок пользования им.<br>Право аренды у победителя либо единственного участника аукциона несостоявшегося аукциона на земельный участок, представленный ему в соответствии с настоящим решением, возникает с момента его государственной регистрации в соответствующей организации по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним и прекращается через 10 (десять) лет со дня регистрации данного права |
| 11 | Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории | Подключение к общим сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД |
| 12 | Начальная цена, рублей | 648 руб. 86 коп. |
| 13 | Сумма задатка, рублей | 60 руб. |
| 14 | Затраты по изготовлению землеустроительной документации, рублей | 1 698 руб. 22 коп. |
| 15 | Стоимость расходов по организации и проведению аукциона (ориентировочно), рублей | 300 руб. |

1. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

2. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Не допускается продажа по начальной цене.

По заявлению победителя аукциона местным исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в местный исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона. Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за предмет аукциона принимается местным исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона заключает с ним договор аренды земельного участка, передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

3. Если аукцион признан несостоявшимся в связи с тем, что заявление на участие в нем подано только одним участником, земельный участок предоставляется этому участнику при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов, с выдачей ему в день признания аукциона несостоявшимся копии протокола о признании аукциона несостоявшимся.

4. Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) **в срок включительно по 14 марта 2018 года** подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, а также представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключается с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

Кроме того, Организатору аукциона представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Документы принимаются по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1).

5. Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Жлобинского районного исполнительного комитета, УНП 400013420,BY73 AKBB 3642 4180 4400 4320 0000, филиал № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобина, БИК AKBBBY21312. Сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре. Контактные телефоны: **8 (02334) 7 21 12, 7 53 01.**

Телефон организатора аукциона **8 (02334) 3 14 08**

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 28 марта 2018 г. проводит открытый аукцион с условиями № 03-У-18 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на трех земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск, пр-т Дзержинского | 1,3045 | Для строительства объекта «Многофункциональный административно-деловой комплекс со встроено-пристроенными помещениями общественного назначения и паркингом по пр. Дзержинского» | 742 259,45 | 110 000,00 | 10 971,03 | Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. 1-й Землемерной, д. 54, 56, 58, 60; ул. 2-й Землемерной, д. 57 | 826 026,56<br>Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 3 104,48 руб.* |
| 2 | г. Минск, ул. Либаво-Роменская | 0,63 | Для строительства объекта «Административное здание с магазином, кафе и подземным паркингом по ул. Либаво-Роменской» | 335 983,63 | 50 000,00 | 10 145,06 | Отселение и снос попадающих под пятно застройки жилых и нежилых строений по ул. Либаво-Роменской, д. 9, 11, 13, 15 | 603 737,10<br>Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 2 470,31 руб.* |
| 3 | г. Минск, на пересечении ул. Либаво-Роменской и ул. Полевой | 0,49 | Для строительства объекта «Административный комплекс с подземным паркингом на пересечении ул. Либаво-Роменской и ул. Полевой» | 263 258,99 | 39 000,00 | 9 083,34 | Отселение и снос попадающих под пятно застройки зданий и сооружений по ул. Либаво-Роменской, д. 3, 5 | 223 889,27<br>Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 1 981,74 руб.* |

* Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету, а также актуализации с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения и соответствующего уровня инфляции.

Возмещение убытков и потерь сельскохозяйственного производства производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **28 марта 2018 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 23 марта 2018 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет № BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 19 февраля 2018 г. по 23 марта 2018 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

– внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

**единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by**

■ Чалавек — чалавеку

# ...БО МЫ РАЗАМ

**Дом, сям'я, падтрымка блізкіх патрэбны кожнаму. Але ж далёка не заўсёды родныя людзі жывуць побач. А вось суседзі...**

На нашай вуліцы няшмат дамоў. Мы будавалі іх больш як 25 гадоў таму, можна сказаць, разам. Гэтак жа потым спраўлялі наваселлі, хрэсьбіны, дружна збіраліся на святы. Ёсць у нас свой гарманіст, душа кампаніі Сяргей Мікалаевіч Жыгар, ёсць свае аўтарытэты. Прыкладам для ўсіх з'яўляецца, у прыватнасці, сям'я Веры Паўлаўны Шкадун. Яны з мужам — былыя настаўнікі, выхавалі пяцёра цудоўных дзяцей, маюць восем унукаў. Прыемна бачыць, як іх нашчадкі амаль кожныя выхадныя прыязджаюць да бацькоў, каб праведаць, каб дапамагчы.

Вось гэта, апошняе, для чалавека, згадзіцеся, надзвычай важна. Мы на нашай вуліцы маем розныя прафесіі: ёсць «свой» псіхолаг, прадавец, інжынеры, настаўнікі, проста рабочыя... Але ў бядзе мы заўсёды разам. За гэтыя гады пайшлі з жыцця трое суседзяў, нехта пахаваў бацькоў. Мы заўсёды стараліся падтрымаць адзін аднаго і маральна, і матэрыяльна, калі трэба, дапамагчы па гаспадарцы.

...Хутка пралятае час. Выраслі нашы дзеці, разляцеліся як быццам, але па-ранейшаму сябруюць паміж сабой. Нашы адносіны з суседзямі сталі прыкладам для іх, а потым, спадзяюся, стануць для ўнукаў. Я дзякую Богу за сваіх суседзяў — Шкадуноў, Кучко-Галубовічаў, Дубаневічаў, Майхерскіх, Жыгараў, Карановічаў... Хай у нашых вокнах заўсёды гарыць святло!

**Тамара Кулеш,**

*Вілейскі раён*

■

■ І смехам, і ўсур'ёз

# Пытанне, што засталося без адказу

**«Жанчына, якая не марыць пахудзець, сустракаецца яшчэ радзей, чым снежны чалавек».**

Не помню, дзе гэта пачула, але ж добра памятаю, як пра адну з запаветных жаночых мар нагадаў... мужчына.

Здарылася гэта некалькі гадоў таму ў нашым райцэнтры. Магазіны там — як у вёсцы: гэта значыць, што яны не толькі месцы для куплі, але і для сустрэч, для размоў, у тым ліку — з прадаўцамі.

Дык вось, неяк у абедзенны перапынак зайшла я ў прадуктовы магазін, стаю там у чарзе ў мясны аддзел і незнарок чую:

— От, прызвычаіўся я замест сыру скрылік добрай каўбасы на бутэрброд класці, — гаворыць пакупнік прадавачкам. — Ды і ўнук ад далікатэсаў не адмаўляецца.

(Хацела б я паглядзець на ўнука, які б адмаўляўся...)

Аднак на гэтым маналог не завяршаецца.

— Я ж як «сеў» на дыету, дык так пахудзеў... Пяцьдзясят кілаграмаў скінуў! — ці то прыдумляе, ці то праўду кажа пакупнік (сярэдняга целаскладу, у гадах...). — От каб яшчэ дзясятачак, дык сама тое было б!

Прадавачкі слухалі яго моўчкі, але ў іх вачах выразна чыталася пытанне: «Дык падзяліцеся сакрэтам, як жа вы так змаглі?!»

Шчыра кажучы, мне таксама карцела спытаць, але мужчына хуценька паклаў у пакет пакупкі, забраў рэшту і гэтак жа імкліва выйшаў з магазіна.

Ці гаварылі што між сабой работніцы крамы, гледзячы ўслед «чэмпіёну» па барацьбе з лішняй вагой?.. Здаецца, не. Я ж супакойвала сябе тым, што калі б мужчына раскрыў свой сакрэт, то гэты невялічкі цуд адразу б перастаў быць цудам.

А можа, дзядзька проста выхваляўся? Бо хіба ж ёсць дыета, якая «прапісвае» есці сыравэнджаную каўбасу?..

Прынамсі, для мяне гэтае пытанне так і засталося без адказу.

**Ірына Матусевіч,**

*Дзяржынскі раён*

■

■ Уражанні

# «ГЭТА ДЗЕЦІ ТВАЕ, ЛЕНІНГРАД...»

**«Больш за ўсё на свеце я люблю хлеб. Просты чорны хлеб...», — прызналася адна з блакадніц Ленінграда, якая жыве ў Мінску.**

Не сцерці з памяці і аповед другой: «Раніца, дакладней — ноч яшчэ. Я іду па хлеб, — успамінала Марыя Ягадніцына, — карткі заціснуты ў кулак. У булачнай ужо чарга. На руцэ пішуць нумар. Усе маўчаць, туляцца адзін да аднаго. Я таксама стаю і плачу, бо дома ляжыць мама, яна ўжо некалькі дзён не ўстае... Прашу людзей «патрымаць» чаргу, каб збегаць дамоў — паглядзець, ці жывая... Вяртаюся назад. Да адкрыцця крамы яшчэ больш за гадзіну, але ж вось нарэшце... Перад вачыма — прылавак, вагі, на іх МОЙ кавалачак чорнага хлеба. Працягваю руку, каб узяць, і раптам... Нечая іншая, доўгая... апярэджвае — хапае мой хлеб. Худы, высокі чалавек, плачучы, запіхвае яго ў рот. А як жа мама?!»



Каля сцяны Піскароўскіх могілак Ірына МАКАРАВА, Марыя ЯГАДНІЦЫНА, Валянціна ПАЛІКАНІНА, Гаргонія ЯРЖЭМБІЦКАЯ і Юлія ФРАЛОВА.

Пра блакаду Ленінграда ведаюць многія, але ж чытаць пра яе ў кнігах, бачыць у фільмах — гэта адно. Зусім іншае — шчырыя няспешныя размовы з людзьмі, з тымі, хто жыў у блакадным горадзе. Людзей такіх засталося, на жаль, няшмат, бо прайшлі дзесяцігоддзі. У мерапрыемствах, прысвечаных святкаванню 74-й гадавіны з дня поўнага прарыву блакады (ленінградскага Дня Перамогі), па запрашэнні мэрыі і камітэта па знешніх сувязях г. Санкт-Пецярбурга прыняла ўдзел і дэлегацыя з Беларусі, якую накіраваў Расійскі цэнтр навукі і культуры ў Мінску, Рассупрацоўніцтва і пасольства Расіі. Такім чынам, у нашых Марыі Ягадніцынай (старшыні «Беларускага саюза блакаднікаў Ленінграда» (якой, як прызнаецца, 14 лютага спаўняецца «без дванаццаці сто»)), Гаргоніі Яржэмбіцкай з Мінска, Юліі Фраловай з Віцебска і іншых з'явілася цудоўная магчымасць сустрэцца з такімі ж блакаднікамі. Нягледзячы на ўзрост і шматлікія хваробы, яны з'ехаліся ў свой горад з 15 краін як блізкага, так і далёкага замежжа.

Праграма сустрэч была цікавая і насычаная. Госці ў выніку змаглі ўбачыць сённяшні, так бы мовіць, парадны Санкт-Пецярбург, пабываць у нядаўна адкрытым Музеі чыгункі і з дапамогай суперсучасных тэхналогій «павандраваць» па мультымедыйным комплексе (плошча якога, дарэчы, 15 тысяч квадратных метраў), дзе прадстаўлена ўся гісторыя Расіі...

Аднак гэта было напярэдадні, а непасрэдна ў гадавіну поўнага зняцця блакады, 27 студзеня, госці накіраваліся на мемарыяльныя Піскароўскія могілкі, дзе пахаваны сотні тысяч жыхароў і абаронцаў горада. Тут, як і належыць, усё было ўрачыста і сумна: голас дыктара, курсанты, якія неслі жалобныя вянкі, велізарная колькасць людзей, якія прыйшлі сюды, каб пакланіцца тым, хто змагаўся за Ленінград і загінуў, хто не выжыў у пекле вайны.

Сярод гэтых людзей былі, вядома ж, і беларусы. Наша дэлегацыя ўшанавала памяць 12 тысяч суайчыннікаў, якія загінулі ў блакаду. Шкада, вядома ж, усіх... Кожнага... А тым больш маладых. Наша краіна мела патрэбу ў спецыялістах, і перад вайной хлопцы і дзяўчаты 14—16 гадоў былі накіраваны ў ленінградскія рамесныя вучэльні. Дадому яны не вярнуліся — навек засталіся сярод блакаднікаў-ленінградцаў. У іх асабовых справах у графе «месца і час адбыцця» напісана: «1942 год, Піскароўскія могілкі».

...Але жыццё працягваецца, і ўсіх удзельнікаў урачыстасцяў чакала яшчэ вялікая канцэртная праграма з выступленнямі любімых артыстаў: Іосіфа Кабзона, Льва Лешчанкі, Валерыі, Зары, харэаграфічнага ансамбля «Бярозка»... У іх выкананні шчыра, кранальна гучалі лірычныя творы мінулых гадоў, дзе гарманічна спалучаюцца словы і музыка, песні пра Ленінград... А ўжо «Дзень Перамогі» спявала ўся зала!

Рэдкія, дзіўныя гэта людзі — блакаднікі: гераічныя, мужныя, моцныя духам. А яшчэ — таварыскія, па-дзіцячы адкрытыя, шчырыя... Нягледзячы на хваробы і сталы ўзрост, яны прыязджаюць у горад, дзе звядалі столькі пакут, ахвотна расказваюць пра свае выпрабаванні і радуюцца, што гэта некаму трэба, што пра іх памятаюць і аб іх клапоцяцца... Напрыканцы свята мікрафон быў дадзены і гасцям з Беларусі.

Я рада, што змагла прачытаць свае вершы, прысвечаныя блакаднікам Ленінграда. А дома напісаліся такія радкі:

*Дай жа, Божа, ім шчасця,*
*хоць трохі!*
*Хай не вернецца пекла блакад.*
*Гэта пульс прамінулай эпохі...*
*Гэта дзеці твае, Ленінград.*

**Валянціна Паліканіна,**
**паэт, публіцыст,**
**член Саюза пісьменнікаў Беларусі**
**і Саюза расійскіх пісьменнікаў**

■

■ Так ці не? Практыкум

# НЕ ВАРТА БАЯЦЦА СКУПОГА

**«У нашай мове ёсць словы *дарадчык, дарадца* і *саветнік,* ёсць *шкло* і *шыба.* Што ў іх агульнага і ў чым розніца? У якіх выпадках кожнае з іх ужываецца?» — пытае спадарыня Наталля Бародзіч.**
**Яна ж цікавіцца, як перакласці на беларускую мову рускае *всем миром.***

**На моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь САЛАМЕВІЧ і Леў ГЛУШЫЦКІ.**

1. **Дарадчык —** нейтральнае слова, якое можна ўжываць у большасці выпадкаў, калі мы гаворым пра тых, хто нешта некаму раіць (радзіць): *злосць — кепскі дарадчык.*

**Саветнік —** гэта назва пасады ў некаторых установах, а таксама чалавека, які такую пасаду займае: *галоўны саветнік старшыні праўлення Нацбанка.*

Слова **дарадца** (як і **дарадчык**) абазначае таго, хто нешта раіць, але, паводле слоўнікаў, мае адценне размоўнасці: *бачылі мы такіх дарадцаў. Бач ты яго, Глянцаперчыка: знайшоўся ён мне дарадчыкам!* (Сакрат Яновіч. «Сцяна»).

2. Розніца паміж **шклом** і **шыбай** ёсць, яна вельмі простая, хоць часта пра яе забываюцца. Першым словам мы называем сам матэрыял, вырабы з якога штодзённа сустракаем у жыцці. Другім — кавалак шкла, устаўлены ў аконную раму. А таму правільна і казаць, і пісаць *праз шыбы цадзілася ранішняе святло; разбілі шыбы мячом...* (Іх пасля гэтага трэба *зашкліць* — памяняць, уставіць шкло, якое і будзе шыбай.)

3. Што да апошняга пытання... У беларускай мове выкарыстоўваецца выраз **усім мірам.** Так усходнія славяне называлі сельскую грамаду. Руска-беларускі слоўнік рэкамендуе перадаваць *всем миром* праз *усёй грамадой.* Аднак такі варыянт не трапіў у аднамоўны «Слоўнік фразеалагізмаў» Івана Лепешава (2008) — найбольш поўны даведнік па фразеалогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Таму правільным трэба лічыць менавіта варыянт *усім мірам.*

Такое ж паходжанне мае і элемент прыказкі **з міру па нітцы — голаму сарочка (кашуля).**

### У абарону слоў

Днямі ў сецівe давялося прачытаць, што словы *«скупы» — відавочны русізм...*

На жаль, той, хто гэта сцвярджае, вельмі памыляецца. Вядома, у нашай мове ёсць сінонімы: прагны, прагавіты, хцівы, сквапны. Але і скупога, як той казаў, ніхто не адмяняў.

Калі зазірнуць у «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы», то мы ўбачым, што скупы — агульнаславянскае слова. Яго адпаведнікі ёсць ва ўкраінскай, польскай, чэшскай і іншых мовах. Да таго ж у беларускай яно стаіць не адасоблена. Мы маем, напрыклад, прыказкі **скупы і з камара кроў высмакча; скупы двойчы плоціць, а дурны двойчы ходзіць; скупы скупуе, а чорт дзірку гатуе...** А таксама шмат слоў розных часцін мовы: **скупіцца, скупасць, скупа, скупеча, скупянда, скупенда.** Таму скупога чалавека, можа, і варта асцерагацца, а вось самога слова — не

■

# Адсканаваць і надрукаваць зубы? Проста!

**Стаматалогія — адна з тых галін медыцыны, дзе шырока выкарыстоўваюцца лічбавыя інавацыі і найноўшыя матэрыялы. Яна, напрыклад, з'яўляецца адной з самых перспектыўных для ўкаранення 3D-тэхналогій. Тое, што яшчэ некалькі гадоў таму здавалася фантастыкай, сёння ўжо рэальнасць.**

У стаматалогіі для лячэння і дыягностыкі ўжо сёння выкарыстоўваецца высокатэхналагічнае абсталяванне: 3D-конусна-прамянёвыя камп'ютарныя тамографы і 3D-інтраарыльныя (унутрыротавыя) сканеры, спецыяльнае праграмнае забеспячэнне па 3D-планаванні ўстаноўкі часовых ці пастаянных пратэзаў і канструкцый для рэстаўрацыі зубоў і сківіцы, выпраўлення прыкусу ці анамалій зубнога рада. Яны дазваляюць зрабіць тое ж пратэзаванне звышдакладным і малатраўматычным, а пацыента вызваляюць ад неабходнасці наведваць стаматолага шмат разоў. Прасцей кажучы, сёння зубы можна «адсканаваць» і «надрукаваць» на прынтары.



Калі яшчэ нядаўна для ўстаноўкі ў сківіцу дэнтальнага імпланта (штыфта) выкарыстоўваўся панарамны здымак, то сёння ва ўсім свеце, у тым ліку і ў Беларусі прымяняюцца так званыя хірургічныя шаблоны.

— Перад тым, як устанавіць імплант, мы маем магчымасць ацаніць стан усёй зубасківічнай сістэмы пры дапамозе 3D-конусна-прамянёвых камп'ютарных тамографаў, — расказвае **загадчык кафедры артапедычнай стаматалогіі і артадантыі з курсам дзіцячай стаматалогіі БелМАПА, доктар медыцынскіх навук Сяргей РУБНІКОВІЧ.** — Грунтуючыся на атрыманых даных і выкарыстоўваючы спецыяльныя праграмы па 3D-планаванні, якія ўжо, дарэчы, уключаюць спецыяльныя бібліятэкі імплантаў розных айчынных і зарубежных вытворцаў, урач-стаматолаг можа разлічыць найбольш дакладнае пазіцыянаванне імпланта з улікам размяшчэння будучай каронкі ці мастападобнага пратэза. Пасля стварэння лічбавай мадэлі 3D-прынтар друкуе хірургічны шаблон. А затым устанаўліваецца імплант з часовай ці пастаяннай канструкцыяй.

Эфектыўныя 3D-тэхналогіі і ў выпраўленні прыкусу. У прыватнасці, актыўна выкарыстоўваюцца спецыяльныя капы — элайнеры, якія таксама вырабляюцца з выкарыстаннем 3D-прынтынгу. Спецыяліст «скануе» ротавую поласць пры дапамозе інтраарыльнага сканера і атрымлівае аналагавы «злепак» сківіц і зубнога рада ў лічбавым фармаце. Затым пры дапамозе спецыяльных камп'ютарных праграм мадэлюе паэтапнае выроўніванне зубоў і на 3D-прынтары «друкуе» капы ў неабходнай колькасці, а пацыент паступова іх мяняе.

— Элайнеры, канешне, не панацэя. Высокую эфектыўнасць яны дэманструюць пры невялікіх анамаліях зубнога рада, — кажа **галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай стаматалагічнай паліклінікі, галоўны пазаштатны спецыяліст па стаматалогіі Міністэрства аховы здароўя Андрэй МАЦВЕЕЎ.** — У той жа час гэта бяспечная альтэрнатыва брэкет-сістэмам, якія негатыўна ўплываюць на цвёрдыя тканкі зубоў.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

# НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ
## НА СЛУЖБЕ НЕЙРАХІРУРГАЎ

**Штогод у РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі робяць каля дзвюх тысяч высокатэхналагічных нейрахірургічных умяшальніцтваў і аказваюць спецыялізаваную дапамогу 6 тысячам пацыентаў, у тым ліку з такімі паталогіямі, як дэгенератыўныя захворванні пазваночніка, самым распаўсюджаным з якіх з'яўляецца астэахандроз, хваробы Альцгеймера і Паркінсона, эпілепсія, а таксама сасудзістыя паталогіі галаўнога і спіннога мозга, у прыватнасці, анеўрызмы сасудаў галаўнога мозга. Спецыялісты цэнтра расказалі пра сучасныя методыкі дыягностыкі і лячэння неўралагічных і нейрахірургічных хвароб.**



### Куды вядзе крывая астэахандроза?

Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ад дэгенератыўных захворванняў пазваночніка пакутуе 87 % працаздольнага насельніцтва планеты ва ўзросце ад 30 да 60 гадоў. Многія спецыялісты іх нават называюць «расплатай чалавека за прамахаджэнне». Болі ў паяснічнай вобласці ці ніжніх канечнасцях, сенсарныя ці рухальныя парушэнні з'яўляюцца другой — па частаце зваротаў да ўрача — прычынай пасля рэспіраторных захворванняў і трэцяй па частаце шпіталізацыі. Гэта адна з галоўных прычын, якая вядзе да інваліднасці ва ўсім свеце. І наша краіна тут не выключэнне. **Намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Эдуард ВАСІЛЕВІЧ** расказвае, што хірургічнае лячэнне дэгенератыўных захворванняў пазваночніка пачалося яшчэ ў сярэдзіне мінулага стагоддзя і актыўна распаўсюдзілася ў 70-х гадах XX стагоддзя. Сёння сярод усіх пашкоджанняў пазваночніка, якія выяўляюцца, хірургічнаму лячэнню падлягае ўсяго 3 %. Цяпер найбольшае распаўсюджанне атрымалі малаінвазіўныя хірургічныя тэхналогіі з выкарыстаннем эндаскопа, так і лазерная пластыка міжпазваночных дыскаў. Аднак нягледзячы на перавагу сучасных тэхналогій, якая заключаецца ў максімальна беражлівых адносінах да косных структур, звязачнага апарату пазваночнага слупа і ў невялікай траўматызацыі мяккіх тканак, ад 8 да 23 % такіх аперацый маюць нездавальняючы вынік. У пацыентаў захоўваецца болевы сіндром, развіваецца аняменні, парэзы пэўнай групы мышцаў, прыходзіцца рабіць паўторныя аперацыі. Але ў апошнія гады хірургічнаму лячэнню аддаюць усё больш перавагі над кансерватыўным.

— Штогод у Беларусі робіцца каля трох тысяч аперацый па прычыне дэгенератыўных захворванняў пазваночніка. Яны праводзяцца не толькі ў Мінску, але і ва ўсіх абласных цэнтрах, а таксама ў Оршы, Бабруйску, Баранавічах, — падкрэсліў Эдуард Васілевіч. —Распрацоўваюцца як новыя тэхналогіі, так і інструментарый, імплантаты для выканання такіх аперацый. У цесным кантакце мы працуем з РНПЦ траўматалогіі і артапедыі, дзе таксама займаюцца лячэннем гэтай паталогіі.

За апошнія гады беларускія спецыялісты вялі даследаванні па двух інавацыйных праектах. Вынікам аднаго з іх, у прыватнасці, стала распрацоўка імплантатаў для дынамічнай стабілізацыі пазваночніка. Яны абмяжоўваюць паталагічную рухавасць (перагінанне) пашкоджаных сегментаў пазваночніка і пры гэтым захоўваюць іх гнуткасць.

### Ліквідаваць наступствы інсульта

Актуальнай ва ўсім свеце застаецца праблема цэрэбраваскулярных захворванняў (хвароб галаўнога мозга, звязаных са змяненнем цэрэбральных сасудаў і парушэннем мазгавога кровазабеспячэння). Інсульт займае першае месца па інваліднасці на планеце, а па лятальнасці саступае толькі хваробам сэрца і злаякасным пухлінам і складае 11—12 %. Найбольш распаўсюджанымі прычынамі яго з'яўляюцца атэрасклероз і артэрыяльная гіпертэнзія. Каля 80 % пацыентаў, якія перанеслі інсульт, становяцца інвалідамі, прычым 10 % — цяжкімі, якім патрэбна пастаянная пабочная дапамога.

Паводле інфармацыі **вядучага навуковага супрацоўніка нейрахірургічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, кандыдата медыцынскіх навук Сяргея КАПАЦЭВІЧА,** у Беларусі ў 325 чалавек на 100 тысяч насельніцтва штогод дыягнастуецца інсульт. У асноўным (каля 80 %) гэта ішэмічны інсульт, астатнія выпадкі — гемарагічны інсульт. Цяпер шырокае прымяненне атрымалі розныя методыкі лячэння апошняга. Адначасова больш актыўна стала праводзіцца і лячэнне ішэмічнага інсульту. Такія аперацыі па самых розных тэхналогіях з выкарыстаннем сучасных матэрыялаў цяпер выконваюць як у абласных цэнтрах, так і на базе РНПЦ «Кардыялогія» і РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі.

Увогуле ж штогод у нейрахірургічных стацыянарах лячэнне атрымліваюць больш за 2,2 тысячы пацыентаў з захворваннямі сасудаў галаўнога і спіннога мозга. У структуры захворваемасці анеўрызмы сасудаў галаўнога мозгу займаюць амаль 40 %, з іх у больш чым 70 % хворых адбываецца разрыў анеўрызмы. Кожны год у Беларусі праводзіцца аперацыі 1,2 тысячы пацыентаў з хваробамі сасудаў галаўнога і спіннога мозга. Сярод іх 30 % — хворыя з анеўрызмай, у тым ліку ў 75 % з іх дыягнаставаны яе разрыў.




Фота БЕЛТА.

### Эпілепсія: ад лячэння адмаўляцца нельга

Адно з самых частых захворванняў нервовай сістэмы — эпілепсія. На яго пакутуе 1 % насельніцтва. Прычым у дзяцей яно сустракаецца гэтак жа часта, як і ў дарослых. Праяўляецца эпілепсія раптоўнымі прыступамі, якія ўзнікаюць з-за паталагічных разрадаў нервовых клетак кары галаўнога мозга. Прыступы могуць выглядаць і працякаць па-рознаму, гэта залежыць ад знаходжання і велічыні зоны мозга, дзе адбываюцца гэтыя разрады.

Прыступ можа быць рухальным (уцягваецца тулава, твар, канечнасці), адчувальным (аняменне, адчуванне болю, поўзання мурашак, парушэнне зроку, слыху, нюху), вегетатыўным (парушэнне дыхання, сардэчнага рытму, пачырваненне скуры, потааддзяленне, слінацячэнне, пашырэнне зрэнак, ірвота) і псіхічным (наплыў думак, адчуванне чагосьці бачанага, перажытага раней, адчуванне знаходжання па-за ўласным целам). Усё пералічанае часам суправаджаецца стратай прытомнасці. Здараюцца і прыступы з кароткім, на некалькі секундаў, «выключэннем» прытомнасці, калі спыняецца дзейнасць, няма рэакцыі, застывае погляд. Нярэдка блізкія бачаць толькі прыступы з парушэннем прытомнасці, з сутаргамі, а больш лёгкія застаюцца незаўважанымі.

**Вядучы навуковы супрацоўнік неўралагічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі, кандыдат медыцынскіх навук Алена ВЯЕЎНІК** адзначае, што прычыны эпілепсіі вельмі розныя, і часта іх увогуле не ўдаецца ўстанавіць. Ёсць дзве асноўныя: структурна-метабалічная, звязаная з пашкоджаннем галаўнога мозга, і генетычныя, звязаныя з прыроджанай схільнасцю да эпілептычных прыступаў.

— Часам лячэнне эпілепсіі трэба пачынаць ужо пасля першага прыступу, — падкрэслівае Алена Вяеўнік. — Хутка дзейнічаць неабходна і з пэўнымі сіндромамі дзіцячага ўзросту, паколькі ў такіх выпадках, акрамя прыступаў, можа парушацца інтэлектуальнае развіццё дзіцяці. Лячэнне эпілепсіі доўгае — ад 2 да 5 гадоў, а часам прыём прэпаратаў патрабуецца на працягу ўсяго жыцця. Пры лячэнні, як правіла, выкарыстоўваецца адзін прэпарат у адэкватнай дозе, у некаторых выпадках трэба некалькі адначасова. Лячыцца неабходна, бо ў выніку адмовы пацыенты траўміруюцца, атрымліваюць пераломы, апёкі, павялічваецца частата і цяжкасць прыступаў, а таксама рызыка раптоўнай смерці ад эпілепсіі.

У Беларусі лячэнне такіх хворых вядзецца на базе РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі і ў абласных бальніцах. Хірургічнае лячэнне эпілепсіі, у тым ліку і высокатэхналагічнае, са стымуляцыяй блукаючага нерва, глыбокай стымуляцыяй мозга, праводзіцца толькі на базе РНПЦ.

— Паказанні да аперацыі і канкрэтны від умяшальніцтва вызначае кансіліум спецыялістаў пасля комплекснага абследавання пацыента і толькі пры ўмове, што медыкаментознае лячэнне неэфектыўнае, — падкрэсліла Алена Вяеўнік.

### Аператыўнае лячэнне хваробы Паркінсона

Колькасць парушэнняў цэнтральнай нервовай сістэмы з сіндромам паркінсанізма з часам павялічваецца ва ўсім свеце. Пасля хваробы Альцгеймера найбольш часта сустракаецца хвароба Паркінсона, якая ўзнікае з-за паступовай гібелі клетак галаўнога мозга і выклікае парушэнні руху з няўстойлівасцю, скаванасцю, дрыжаннем канечнасцяў. Яна абумоўлена генетычнымі фактарамі, знешнім асяроддзем, працэсамі старэння і сустракаецца ў 1—3 % насельніцтва ва ўзросце ад 65 гадоў. Яе распаўсюджанасць ва ўсіх этнічных групах тлумачыцца павелічэннем працягласці жыцця.

Як расказаў **старшы навуковы супрацоўнік нейрахірургічнага аддзела РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі Уладзімір АЛЕКСЕЯВЕЦ,** галоўнай задачай тэрапіі падчас лячэння хваробы Паркінсона з'яўляецца аднаўленне парушаных рухальных функцый з выкарыстаннем мінімальных доз прэпаратаў. Калі ад кансерватыўнай тэрапіі няма дастатковага эфекту, можа прымяняцца аператыўнае лячэнне:

— Перавага аддаецца храналічнай высокачастотнай стымуляцыі глыбокіх структур мозга з выкарыстаннем імплантаваных электрапрыладаў. Гэта больш сучасны метад нейрахірургічнага лячэння. У Беларусі яно праводзіцца спецыялістамі РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі на працягу некалькіх апошніх гадоў.

## Дайджэст



### ТАТУ ПАКЛАПОЦЯЦЦА ПРА СКУРУ

**Шмат загараць на сонцы зусім не карысна, таму, каб зберагчы людзей ад негатыўных наступстваў загару, створана мноства розных вынаходак. Але ні адзін з крэмаў або парасонаў не можа своечасова папярэджваць чалавека аб тым, што яму час ісці ў цень.**

Таму кампанія LogicInk стварыла спецыяльныя нацельныя пераводныя наклейкі, якія паведамляюць карыстальніку гэтую карысную інфармацыю. Наклейкі ў выглядзе двух колаў ці палосак не змываюцца вадой, а яшчэ на іх можна наносіць сонцаахоўны крэм. Нанесеная на цела часовая тату мяняе пад сонечнымі прамянямі свой колер і становіцца фіялетавай. Чым ярчэйшае адценне, тым больш інтэнсіўнае выпраменьванне ўздзейнічае на скуру.

Другая палоска або круг складаецца з трох частак, якія таксама па чарзе мяняюць свой колер. Як толькі ўсе тры сегменты ў выніку ўздзеяння ўльтрафіялету становяцца яркаружовымі, чалавеку час перастаць загараць — сваю норму загару ён ужо на сёння атрымаў. Павышаныя дозы ўльтрафіялету павялічваюць рызыку развіцця злаякасных пухлін і спрыяюць з'яўленню маршчын, гэта даўно вядома, таму такія часовыя смарт-тату змогуць дапамагчы людзям са светлай скурай бяспечна праводзіць час на сонцы.



### СМАРТФОНАМ ЗРОБЯЦЬ АЛМАЗНЫЯ ЭКРАНЫ

**Як бы акуратна ўладальнік ні карыстаўся сваім смартфонам, на яго экране з часам непазбежна ўтвараюцца сколы і драпіны. Не ратуе і наяўнасць ахоўнага шкла, плёнкі і спецпакрыццяў. Нават устойлівыя Gorilla Glass і сапфіравае шкло ад Apple рана ці позна прыходзяць у непрыдатнасць. Але ўсё можа змяніць шкло са штучнага алмаза, да выпрабавання якога ўжо прыступіла амерыканская кампанія Akhan Semiconductor.**

Новае шкло атрымала назву Mirage Diamond Glass, і яно тэсціруецца ў лабараторыях кампаніі ў адной з мадэляў смартфона ўжо зараз. У яго аснове ляжыць асаблівая структура са штучных алмазаў, якая ў працэсе вытворчасці фарміруецца выпадковым чынам. Гэта перашкаджае стварэнню глыбокіх расколін і пашкоджанню матэрыялаў пад самім пакрыццём. Як заявіў кіраўнік Akhan Semiconductor Адам Хан, «новае шкло можа выкарыстоўвацца як самастойна, так і ў спалучэнні з іншымі тыпамі пакрыцця. Цяпер новая тэхналогія праходзіць актыўную фазу выпрабаванняў, у якой удзельнічаюць многія буйныя вытворцы мабільнай электронікі. Мы праводзім стрэстэсты для таго, каб пераканацца ў трываласці алмазнага шкла і высветліць, што яно добра праводзіць электрычныя імпульсы і не замінае распазнаваць дотыкі». Mirage Diamond Glass можа быць выкарыстана на любой прыладзе, але ў першую чаргу яно з'явіцца на смартфоне, рэліз якога запланаваны на 2019 год ■

## Ну і ну!

### Дарвін, ты памыляешся

#### Людзі пайшлі ад кракадзіла?

**Амерыканскія даследчыкі ў Паўночна-Заходнім універсітэце ўсумніліся ў тэорыі Дарвіна, якая адмаўляе боскае паходжанне чалавека і ўсяго жывога.**

Амерыканскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што існуючая тэорыя паходжання чалавека ў корані няправільная. Сёння навуковая супольнасць працягвае лічыць, што продкамі людзей былі малпы. Група амерыканскіх даследчыкаў з Паўночна-Заходняга ўніверсітэта вылучыла новую гіпотэзу аб працэсе эвалюцыі, паводле якой чалавек мог пайсці ад кракадзілападобных рэптылій, якія засялялі нашу планету 400 млн гадоў таму. Даныя даследавання былі апублікаваныя на сайце ўніверсітэта.

Праўдзівы даследаванні выкапняў рэшткаў жывёл таго часу, нейрафізік прафесар Макiвер і біёлаг-эвалюцыяніст прафесар Ларс Шмітц прыйшлі да высновы, што рыбу вывеў на сушу перш за ўсё зрок. Так навукоўцы высветлілі, што менавіта эвалюцыя органаў зроку пасля прывяла да развіцця ў вадаплаўных канечнасцяў. Падобныя змены ў арганізмах жывёл, на думку навукоўцаў, былі выкліканы тым, што жывёлы бачылі ў сухапутных насякомых, якія засялялі планету ў той час, больш лёгкую здабычу. Развіццё органаў зроку, у сваю чаргу, прывяло да павелічэння мозга ў ранніх наземных пазваночных жывёл, ад якіх у далейшым пайшлі людзі. Версія як мінімум незвычайная, але далей пакуль даследчыкі не прадставілі доказаў і прыкладаў развіцця і абгрунтавання сваёй тэорыі.

## Гісторыя



# У ЕГІПЦЕ ЗНАЙШЛІ ГРАБНІЦУ ВЫСАКАРОДНАЙ ЖРЫЦЫ

**Непадалёк ад пірамід Гізы археолагі знайшлі грабніцу, пабудаваную 4000 гадоў таму. Магіла належала жрыцы, набліжанай да фараона з Пятай дынастыі.**

Некропаль Гізы — буйны комплекс пахаванняў на тэрыторыі Мемфіса, сталіцы Старажытнага Егіпта. Яго самымі вядомымі аб'ектамі з'яўляюцца скульптура сфінкса і піраміды — у тым ліку знакамітая піраміда Хеопса. Раскопкі ў гэтым раёне вядуцца на працягу многіх гадоў, і нядаўна археолагі адкрылі грабніцу жрыцы па імені Хетпет. Жрацамі ў Старажытным Егіпце ў асноўным былі мужчыны; жанчыны маглі прыслужваць толькі абраным багам — у прыватнасці, багіні прыгажосці і ўрадлівасці Хатхор. Хетпет была жрыцай менавіта пры яе храме.

Падобны статус набліжаў жанчыну да сям'і фараонаў, і пахавальныя рытуалы ў яе гонар адрозніваліся адмысловымі ўшанаваннямі. Гліняна-цагляныя сцены грабніцы пакрытыя маляўнічымі роспісамі. На некаторых карцінах намалявана сама Хетпет, якая добраслаўляе паляванне і рыбалку ці сядзіць за сталом, поўным дароў. На іншых можна ўбачыць людзей, якія займаюцца топкай металу, вырабам скураных рэчаў або танцамі. Незвычайнымі з'яўляюцца малюнкі, на якіх паказаны ручныя малпы: яны танцуюць ці збіраюць садавіну. Як тлумачаць археолагі, гэта толькі другі падобны малюнак у свеце: першы, які адносіцца да XII стагоддзя, быў знойдзены ў раёне пасёлішча Сакара за 30 км на поўдзень ад Каіра.

Хетпет жыла 4400 гадоў таму, падчас кіравання Пятай дынастыі фараонаў. Гэты перыяд у гісторыі Егіпта лічыцца адным з самых значных: таады, напрыклад, з'явіліся Тэксты пірамід, культы Асірыса і Ра сталі набіраць сілу, а па ўсёй краіне было пабудавана мноства пірамід і палацаў. Аднак мумія жанчыны да гэтага часу не знойдзеная: археолагі не выключаюць, што ў яе гонар было пабудавана некалькі пахавальных комплексаў і галоўны можа знаходзіцца ў заходняй частцы некропаля Гізы.

## Неферціці ці проста «юная лэдзі»?



**Адна з самых характэрных егіпецкіх мумій атрымала твар: навукоўцы аднавілі аблічча маладой жанчыны, якая магла быць маці фараона Тутанхамона.**

У 1898 годзе ў даліне Цароў была знойдзена мумія, занесеная ў рэестр пад імем KV35YL («YL» — ад англ. Younger Lady — «юная лэдзі»; першыя літары і лічбы — парадкавы нумар грабніцы). Доўгі час спецыялісты спрабавалі ўсталяваць яе асобу. У 2001—2003 гадах егіптолагі знайшлі шэраг ускосных прыкмет, якія пацвярджалі царскае паходжанне муміі. Тады ж была зробленая першая рэканструкцыя яе прыжыццёвага аблічча, у выніку чаго выявілася падабенства з сусветна вядомай Неферціці (яе знешнасць вядомая дзякуючы бюсту, знойдзенаму ў 1912 годзе). Аднак многія навукоўцы не пагадзіліся з гэтымі высновамі, а праведзены ў далейшым аналіз ДНК канчаткова абверг гіпотэзу аб царыцы.

«Юная лэдзі» была ідэнтыфікаваная як маці Тутанхамона. Паводле некаторых здагадак, яна таксама была і сястрой фараона Эхнатона, але гэта даказаць не атрымліваецца: з-за пастаянных родасных скрыжаванняў, прынятых у той час, усталяваць выразныя генетычныя лініі вельмі складана.

Гісторыя гэтай жанчыны працягвае займаць навукоўцаў, і нядаўна даследчык Эйдэн Додсан з Брыстальскага ўніверсітэта атрымаў дазвол на далейшыя даследаванні муміі. Спецыялісты правялі трохмернае сканіраванне і склалі лічбавую карту твару. Для трохмернай рэканструкцыі была запрошаная Элізабэт Дэйніс — палеамастак, якая ўжо працавала над узнаўленнем твараў старажытных людзей, у тым ліку самога Тутанхамона. Па выніках яе працы высветлілася, што «Юная лэдзі» ўсё ж вельмі падобная да Неферціці. На аснове гэтага некаторыя навукоўцы зноў заявілі, што KV35YL і з'яўляецца знакамітай царыцай, але з улікам астатніх гістарычных даных гэта так і застаецца гіпотэзай.

## Даследаванні

# МЕНШ БЫВАЙ У ІНТЭРНЭЦЕ...

### Што робіць чалавека няшчасным



**Амаль усім людзям падабаецца думаць, што яны ўнікальныя і іх праблемы выключна індывідуальныя. Зрэшты, бывае і такое, аднак даволі рэдка. А вось новае даследаванне выявіла, што многія людзі часцяком няшчасныя па адной і той жа прычыне. Гэта адбываецца не з-за працы, недахопу грошай або руціны, прычына можа быць таксама ў тым, што вы працягваеце чытаць гэты артыкул менавіта ў інтэрнэце.**

Даследаванне, апублікаванае на партале Амерыканскай псіхалагічнай асацыяцыі, паказала, што з мільёна падлеткаў, апытаных у ЗША, самыя нешчаслівыя праводзяць шмат часу каля экранаў. З усіх апытаных падлеткаў тыя, хто прызнаўся, што праводзіць больш за пяць гадзін штодзень у сваіх тэлефонах, у інтэрнэце, гуляючы ў відэа-гульні, або хто проста глядзіць тэлевізар, у асноўным аказаліся нешчаслівымі. Такое даследаванне праводзіцца штогод з 1991 года і ахоплівае выключна навучэнцаў ад восьмых да дванаццатых класаў у амерыканскай школьнай сістэме.

